ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

5 СТУДЗЕНЯ 2017 г. ЧАЦВЕР № 3 (28367)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

Хто ў школе ідэал?

Мільён руж сярод зімы

«Мама, я тату́ хачу!»

СВЯТА ДОБРАГА ХАКЕЯ

Учора ў Мінску на лёдзе «Чыжоўка-Арэны» стартаваў XIII Калядны міжнародны турнір аматараў хакея на прыз Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Сёлета ён сабраў рэкордную колькасць краін-удзельнікаў — пазмагацца за галоўны прыз прыехалі прадстаўнікі пятнаццаці дзяржаў.

Адкрываючы хакейнае свята, Аляксандр Лукашэнка выказаў упэўненасць, што гледачоў і балельшчыкаў «чакаюць займальныя і яркія баталіі на лядовых арэнах. Зноў тварам да твару сыдуцца каманды, якія гатовыя ўпарта змагацца за галоўны прыз, паказаць гледачам высокі клас гульні». «Да нас прыехалі пераможцы і прызёры чэмпіянатаў свету, Алімпійскіх гульняў, хакеісты, якія выступалі ў НХЛ», — адзначыў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што хакей карыстаецца асаблівай любоўю і ўвагай беларусаў. «Нашы гледачы змогуць па вартасці ацаніць дакладны кідок, галявы пас, самаадданую гульню варатара, філігранную тэхніку нападаючага і зладжанасць дзеянняў кожнай з каманд. Госці сталіцы пераканаюцца ў традыцыйнай гасціннасці беларускага народа, змогуць пазнаёміцца з Беларуссю, яе гісторыяй і культурай, здабыць новыя цікавыя кантакты. Бо спорт — гэта найлепшая форма народнай дыпламатыі», — лічыць беларускі лідар.

Ужо ў першы дзень турніру прайшлі паядынкі паміж зборнымі Германіі і Фінляндыі, Балкан і Швейцарыі, Славакіі і Расіі. Пасля цырымоніі адкрыцця адбыўся матч паміж зборнымі Беларусі і ААЭ, які скончыўся, калі нумар ужо быў падпісаны. За зборную нашай краіны гуляў і Прэзідэнт.

Турнір прадоўжыцца да 7 студзеня. Па традыцыі ўваход на гульні бясплатны, а каля «Чыжоўка-Арэны» арганізаваныя святочныя гулянні.

Фота БЕЛТА.

Турнір стартаваў матчам Фінляндыя — Германія (11:3).

СНЕЖНАЯ ФІЗКУЛЬТУРА

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Учора пасля снегападу вучні сталічнай школы №30 разам з настаўнікам фізкультуры Леанідам МАШАЎЦОМ выйшлі чысціць школьны стадыён, каб потым – з маразамі — заліць на ім каток.

ЦЫТАТА ДНЯ

Валянцін МІХНЕВІЧ, старшыня Пастаяннай камісіі па нацыянальнай бяспецы Палаты прадстаўнікоў:

«Беларускія праваахоўныя органы ўдасканальваюць метады работы з улікам новых выклікаў. Мы павышаем узровень баявой падрыхтоўкі, мадэрнізуем усе свае тэхнічныя сродкі, што спрыяе і павышэнню ўзроўню абараназдольнасці, і гарантаванню грамадскай бяспекі. Нарматыўная прававая база краіны таксама дазваляе аператыўна рэагаваць на ўсе выклікі і пагрозы сучаснасці. Нашы праваахоўнікі працуюць над тым, каб быў эфектыўны інструментарый для процідзеяння, папярэджання, прафілактыкі злачынстваў».

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 5.01.2017 г.

Долар ЗША	1,9707	▲
Еўра	2,0534	▼
Рас. руб.	0,0322	▲
Укр. грыўня	0,0733	▲

ISSN 1990 - 763X

■ «Звязда» даследуе праблему

АВАРЫЙНЫЯ БУДЫНКІ ЦІ ГІСТАРЫЧНАЯ СПАДЧЫНА?

Ці ўдасца знайсці залатую сярэдзіну ў спрэчках аб лёсе нізкапавярховых забудоў у цэнтры сталіцы?

Тыя, хто не быў у нашай сталіцы некалькі дзесяцігоддзяў, а нават і гадоў, прыкмячаюць, што аблічча Мінска імкліва мяняецца. З'яўляюцца новыя ўражальныя будынкі і цэлыя раёны. Пры гэтым зберагчы непаўторны дух «старога Менска» атрымліваецца далёка не заўсёды. Летась спрэчкі аб захаванні будынкаў і насаджэнняў разгарэліся ў некаторых старых раёнах сталіцы асабліва эмацыянальна. Сучасныя «бітвы» за Асмалоўку і Сельгаспасёлак сталі тэмай для актыўнага абмеркавання ў сеціве і падставай для зваротаў у розныя інстанцыі. Што ж там адбываецца насамрэч?

Новая транспартная магістраль або душэўная Асмалоўка?

Раён у межах цяперашніх вуліц Кісялёва, Куйбышава, Камуністычнай і Багдановіча быў пабудаваны ў першыя пасляваенныя гады. Сваю назву ён атрымаў у гонар архітэктара Міхаіла Асмалоўскага, які займаўся распрацоўкай праекта. Узводзілі двухпавярховыя домікі палонныя немцы і італьянцы.

Ужо ў тыя гады архітэктара крытыкавалі за тое, што ён пабудаваў «вёску» ў цэнтры Мінска. Аднак сімпатычныя дамы, з густам аздобленыя элементамі дэкору ў еўрапейскай стылістыцы, хутка стварылі раёну славу элітнага. Гэта меркаванне толькі ўмацавалася ў 1950-я гады, калі Асмалоўку абнеслі мураванай агароджай, якая нават закрывалася на ноч: уваход ажыццяўляўся толькі па прапусках ці запрашэнні гаспадароў.

Публіка жыла тут адпаведная статусу «вяршкоў» грамадства: афіцэры, супрацоўнікі міністэрстваў, прафесары. Праз некаторы час абсталявалася тут і творчая эліта — артысты Вялікага тэатра оперы і балета, мастакі. Дарэчы, славу «багемнага» раён захаваў за сабой да гэтага часу. На невялікай тэрыторыі знаходзіцца восем мастацкіх майстэрняў.

СТАР. 4

І мароз не бяда, бо на лёдзе — горача

Стартаваў Калядны турнір

Усе каманды прыбылі ў Мінск яшчэ 3 студзеня. Самым «хакейным» атрымаўся авіярэйс з Вены. На сваім борце да нас ён даставіў адразу тры зборныя — Славакіі, Швейцарыі і каманду Балкан. Нягледзячы на аматарскі статус турніру, падрыхтоўку каманды правялі сур'ёзную — адразу пасля пералёту хакеісты засяліліся ў гатэль, а ўвечары ўжо правялі першыя трэніроўкі. У вопытных спартсменаў было крыху больш за гадзіну на тое, каб паспрабаваць беларускі лёд. А ўчора на ім яны правялі свае першыя паядынкі.

Сёлета на турніры выступаюць зборныя з Германіі, Аб'яднаных Арабскіх Эміратаў, Расіі, Славакіі, Фінляндыі, Швейцарыі, а таксама пачатковец — каманда Балкан. Інтэрнацыянальная зборная прадстаўлена хакеістамі з 8 краін — Румыніі, Сербіі, Балгарыі, Македоніі, Славеніі, Харватыі, Турцыі, Босніі і Герцагавіны. Швейцарская каманда разам з гаспадарамі, расіянамі, фінамі і немцамі — старажылы турніру, але як разгорнецца барацьба, будзе відаць далей. Рэгламент спаборніцтваў не змяніўся. На папярэднім этапе зборныя падзелены на дзве групы, пасля чаго дружыны, якія занялі ў сваіх квартэтах другія месцы, разыграюць бронзавыя медалі. Пераможцы сустрэнуцца ў фінальным паядынку.

Першы Калядны міжнародны аматарскі турнір на прыз кіраўніка дзяржавы быў праведзены 4 студзеня 2005 года. Цяперашнія спаборніцтвы трынаццатыя па ліку.

За гэты час удзельнікамі неафіцыйнага чэмпіянату свету сярод аматараў сталі хакеісты з 16 краін. З-за акіяна да нас прыязджалі канадцы, трэці раз сёлета барацьбу за кубак павядзе самая экзатычная для гэтага віду спорту каманда з Аб'яднаных Арабскіх Эміратаў.

Для нас Калядны турнір стаў яшчэ адной выдатнай магчымасцю паказаць краіну ўсяму свету, для ўдзельнікаў турніру — шанцам сустрэцца са старымі сябрамі, а для ўсіх беларусаў — гэта ўжо даўно вялікае сямейнае свята.

У стартавы дзень спаборніцтваў удзельнікі падзяліліся сваімі першымі ўражаннямі:

Марцін Штрбак, абаронца зборнай Славакіі:

— На Калядным турніры ў Мінску заўсёды ўсё на высокім узроўні, я сказаў бы, як на звычайным чэмпіянаце свету. Таму ўжо не першы раз прыязджаю на гэты турнір і заўсёды адпраўляюся ў Мінск з задавальненнем.

Крэсімір Свігер, нападаючы зборнай Балкан:

— У вас у гасцях, у Мінску, спадзяюся весела правесці час і пазнаёміцца з цікавымі людзьмі. Я шмат чуў пра гэты турнір ад іншых хакеістаў, якія ўжо прыязджалі сюды, таму вырашыў прыехаць і сам.

Томас Грыга, нападаючы зборнай Швейцарыі:

— Чуў, што Беларусь часта называюць маленькай Швейцарыяй. Пакуль не магу параўноўваць, таму што толькі нядаўна прыехаў. Але думаю, што гэта так.

Міхаэль Брэсак, абаронца зборнай Германіі:

— Я тут трэці раз. Заўсёды прыязджаю з задавальненнем. Мінск з году ў год становіцца ўсё больш прыгожым. Вельмі сучасны еўрапейскі горад. Чысціня вакол, смачная ежа, добрыя людзі.

Крысціян Хальбер, варатар зборнай Германіі:

— Мы кожны раз атрымліваем асалоду ад візітаў у Беларусь. Турнір з кожным годам становіцца ўсё больш сур'ёзным, узровень хакеістаў павышаецца, гуляць становіцца ўсё складаней. Але сёлета нашу каманду ўзмацнілі некалькі экс-гульцоў зборнай Германіі, таму мы разлічваем толькі на перамогу.

Саід Аль-Нуаімі, нападаючы зборнай Аб'яднаных Арабскіх Эміратаў:

— У Беларусі я трэці раз, таму ваша надвор'е для мяне ўжо не сюрпрыз. Яно мне нават падабаецца. Вядома, тэмпература значна адрозніваецца ад той, якая ў Эміратах, — у нас горача ў гэты час года, але мы былі гатовыя да халадоў, таму ўзялі з сабой вельмі шмат цёплых рэчаў.

Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ. *lobazhevich@zviazda.by*

■ Будзь у курсе!

ЯК ПАТРАПІЦЬ НА ХАКЕЙНЫ ТУРНІР?

У сувязі з правядзеннем Каляднага міжнароднага турніру аматараў хакея на прыз Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь у «Чыжоўка-Арэне» дзяржаўнае прадпрыемства «Мінсктранс» арганізуе работу шэрагу маршрутаў грамадскага транспарту.

Так, гаворка ідзе пра тралейбусны маршрут №926 «Ст. м. «Аўтазаводская» — «Чыжоўка-Арэна»: 5 студзеня — з 12 да 22 гадзін; 6 студзеня — з 13 да 22 гадзін; 7 студзеня — у перыяд з 11 да 22 гадзін.

Таксама арганізуецца работа аўтобуснага маршрута №926 «Ст. м. «Аўтазаводская» — «Чыжоўка-Арэна»: 7 студзеня — у перыяд з 11 да 13 гадзін і з 15 да 18 гадзін.

7 студзеня ў перыяд з 11 да 18 гадзін будзе павялічана колькасць рухомага саставу на тралейбусным маршруце №49.

Сяргей РАСОЛЬКА. *rs@zviazda.by*

■ Сацыяльны клопат

МІСІЯ — ДАПАМАГАЦЬ

Сёння ў нашай краіне адзначаецца Дзень работнікаў сацыяльнай абароны

Гэта свята непасрэдна датычыцца больш як 37 тысяч чалавек, якія працуюць у органах па працы, занятасці і сацыяльнай абароне і ў падпарадкаваных ім арганізацыях. А таксама, думаецца, яно датычыцца і іх падапечных. А гэта — ні многа ні мала — больш за 1,8 млн людзей, якія стаяць на ўліку ў тэрытарыяльных цэнтрах сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва.

Пачаў працаваць закон аб альтэрнатыўнай службе

У гэтым годзе Дзень сацыяльнага работніка могуць назваць у нейкай ступені сваім святам і 13 маладых людзей, якія 30 снежня 2016 года прыступілі да праходжання альтэрнатыўнай службы. Яе выбралі тыя, хто не можа прымаць прысягу і насіць зброю праз рэлігійныя перакананні.

Накіроўваць на альтэрнатыўную службу могуць не толькі ў арганізацыі сацыяльнай сферы, але і ў арганізацыі аховы здароўя, жыллёва-камунальнай, сельскай і лясной гаспадаркі і інш. Але, як патлумачыў **намеснік міністра працы і сацыяльнай абароны Аляксандр РУМАК**, большасць прызыўнікоў, якія выбралі альтэрнатыўную службу, праходзяць яе ва ўстановах сацыяльнага абслугоўвання, дамах-інтэрнатах.

Аб працы і заробках

Права працаваць — найважнейшая гарантыя для людзей, якая забяспечвае прымальны ўзровень жыцця. Па словах Аляксандра Румака, у мінулым годзе на садзейнічанне занятасці насельніцтва накіравана больш за 32 млн рублёў, у тым ліку звыш 30 млн — са сродкаў бюджэту фонду сацыяльнай абароны насельніцтва.

Што датычыцца аплаты працы, то на сённяшні дзень, па словах намесніка міністра працы і сацыяльнай абароны, зняты ўсе адміністрацыйныя бар'еры і абмежаванні па рэгуляванні заработнай платы ў рэальным сектары эканомікі. Гэта значыць, што наймальнікі прапаноўваюць сваім работнікам зарплату, якая адпавядае фінансавым магчымасцям іх арганізацый. Галоўнай умовай росту зарплаты пры гэтым з'яўляецца эканамічная эфектыўнасць прадпрыемства, у тым ліку рост прадукцыйнасці працы. У дзяржаўным сектары застаюцца дзейнічаць рэгулятары заработнай платы.

Для абароны інтарэсаў нізкааплатных работнікаў важную ролю адыгрывае мінімальная заработная плата як найніжэйшая мяжа аплаты працы. З 1 студзеня 2016 года мінімальная заработная плата складала 230 рублёў, яе суадносіны з намінальнай налічанай сярэднямесячнай заработнай платай за 2015 год склалі 34,2%. Як правіла, у краінах з развітой эканомікай гэтыя суадносіны знаходзяцца ў дыяпазоне 30—45%.

Атрымальнік пенсіі — кожны чацвёрты

На сённяшні дзень у органах па працы, занятасці і сацыяльнай абароне атрымліваюць пенсіі 2,6 млн чалавек, ці 27,6% насельніцтва краіны. Суадносіны сярэднямесячнага памеру пенсіі па ўзросце і сярэднямесячнай заработнай платы ў рэспубліцы ў мінулым годзе былі забяспечаны на ўзроўні не ніжэй за 40%. Гэта, па словах намесніка міністра працы і сацыяльнай абароны, адпавядае нацыянальным праграмным дакументам і міжнародным падыходам.

У цэлым у апошнія гады пенсійныя выдаткі складаюць каля 9% ВУП.

Нараджацца стала больш, чым паміраць

«Нас радуе вынік рэалізацыі сямейнай палітыкі», — паведаміў Аляксандр Румак. Нядаўна мы ўпершыню за апошнія 20 гадоў выйшлі на натуральны прырост насельніцтва, калі нараджаецца больш людзей, чым памірае. Да таго ж, цяпер больш за 57% нованароджаных — гэта другія і наступныя дзеці ў сем'ях. Расце, паводле слоў намесніка міністра, і колькасць шматдзетных сем'яў.

Два гады таму ў нашай краіне быў уведзены сямейны капітал — аднаразовае выдаткаванне безнаяўных грашовых сродкаў у памеры 10 тыс. долараў пры нараджэнні, усынаўленні (удачарэнні) трэцяга або наступных дзяцей. За перыяд рэалізацыі гэтай праграмы ў Беларусі адкрыта 28 824 дэпазітных рахункаў на сямейны капітал на агульную суму больш за 288 млн долараў.

Работнікаў сацыяльнай абароны з прафесійным святам павіншаваў Прэзідэнт. «Ваша добрасумленная і самаадданая праца, уменне суперажываць і імкненне дапамагаць бліжняму захоўваюць веру ў ідэалы дабра і справядлівасці», — гаворыцца ў віншаванні.

Аляксандр Румак адзначае, што сістэма дзяржаўных дапамог сем'ям з дзецьмі функцыянуе стабільна. Развіваюцца і новыя віды сацыяльных паслуг для сем'яў.

Найбольш запатрабаванай на сёння формай сацыяльнага абслугоўвання пажылых і інвалідаў з'яўляецца дапамога на даму. Яе атрымліваюць каля 89 тысяч непрацаздольных жыхароў краіны.

Святлана БУСЬКО.
busko@zviazda.by

■ Тры пытанні да ўлады

ДАРОГА БУДУЧЫНІ АРШАНШЧЫНЫ

Орша — адзін з найстарэйшых гарадоў Беларусі і адзін з найбуйнейшых па колькасці насельніцтва раённых цэнтраў. Сярод прычын яго імклівага развіцця варта ў першую чаргу назваць зручнае геаграфічнае становішча — пабудова транспартных артэрый, якія злучалі Еўропу з Азіяй і поўнач колішняй Расійскай імперыі з поўднем, хутка зрабілі горад буйным чыгуначным і аўтамабільным вузлом. Менавіта гэтая перавага адкрывае перад Оршай новыя перспектывы і ў XXI стагоддзі — неўзабаве ў рэгіёне павінен з'явіцца буйны лагістычны цэнтр, які дасць штуршок развіццю мясцовай эканомікі. Пра ажыццяўленне гэтай задумы, а таксама пра іншыя планы і дасягненні «Звяздзе» расказаў старшыня Аршанскага райвыканкама Мікалай ЛІСОЎСКІ.

— Як праходзіць рэалізацыя інвестыцыйнага праекта — будаўніцтва прамыслова-лагістычнага комплексу «Балбасава»?

— Згодна з Указам Прэзідэнта краіны, гэты цэнтр будзе створаны да канца 2023 года. У яго склад увойдуць збудаванні для арганізацыі прамысловай вытворчасці, як мінімум два адміністрацыйныя будынкі, гасцініцы, складскія карпусы плошчай не менш за 50 тысяч квадратных метраў, пляцоўкі для размяшчэння велікагрузнага аўтатранспарту (на 500 стаянчных месцаў), а таксама аб'екты інжынернай і транспартнай інфраструктуры.

Цяпер скончылася распрацоўка праектна-каштарыснай дакументацыі першай чаргі будаўніцтва. На першым этапе да пляцоўкі будзе падведзена дарога, інжынерныя сеткі, пабудаваны склад з адміністрацыйна-бытавым комплексам і аўтастаянка. Работа ўжо пачалася — цяпер ствараецца пад'езд да аб'екта з бетонным пакрыццём. Акрамя гэтага, нядаўна было распрацавана абгрунтаванне інвестыцый у будаўніцтва пад'язнога шляху, які злучыць паміж сабой трасы Р-15 (Крычаў — Орша — Лепель) і Р-76 (Орша — Шклоў — Магілёў), цяпер завяршаецца распрацоўка дакументацыі па гэтым праекце.

Хачу адзначыць, што ў кастрычніку з пачаткам будаўніцтва комплексу «Балбасава» пазнаёміўся прадстаўнік будаўніча-інвестыцыйнай карпарацыі кітайскай правінцыі Ганьсу, дырэктар яе беларускага прадстаўніцтва ТАА «Сігікоп-Бел» Ян Ліцзэ. Па выніках наведвання будаўнічай пляцоўкі і наступных перагавораў нашы калегі з КНР праявілі прадметны інтарэс да будучага аб'екта.

— Нядаўна Еўрапейскі банк рэканструкцыі і развіцця (ЕБРР) прыняў рашэнне выдзеліць гораду грошы на рэканструкцыю сістэмы водазабеспячэння, ці асвойваюцца гэтыя сродкі?

— Сапраўды, у рамках рэалізацыі рамачнага праекта муніцыпальнай экалагічнай інфраструктуры Беларусі (дакладней, другога этапу Праграмы па водным сектары) прадугледжваецца мадэрнізацыя сістэм кіравання водазабеспячэннем і водаадвядзеннем Оршы ў супрацоўніцтве з ЕБРР. Для яе ажыццяўлення спецыялісты адной з экспертных кампаній летась праводзілі даследаванне стану водаправодна-каналізацыйнай гаспадаркі Аршанскага раёна. На выніках гэтай работы быў створаны перспектыўны праект водазабеспячэння горада, які прадугледжвае мадэрнізацыю ачышчальных збудаванняў, аднаўленне калектараў, рэканструкцыю каналізацыйных насосных станцый.

Для яго рэалізацыі было прынята рашэнне аб выдзяленні гранту ў памеры трох мільёнаў еўра, а таксама крэдыту памерам шэсць мільёнаў еўра дзяржаўнаму прадпрыемству «Аршавадаканал». Яго спецыялісты на падставе ўсё таго ж мінулагодняга даследавання распрацавалі бізнес-план, які быў зацверджаны ў Міністэрстве эканомікі. Напрыканцы кастрычніка ЕБРР прадставіў праекты грантавага і крэдытнага пагадненняў, у якія наша прадпрыемства ўнесла свае заўвагі і прапановы. Таму ў хуткім часе можна чакаць старту ажыццяўлення задумы. Дарэчы, аналагічныя праекты будуць рэалізоўваць прадпрыемствы водазабеспячэння Ліды і Полацка.

— Сёлета Орша будзе адзначаць свой 950-гадовы юбілей. У 2017-м мы будзем святкаваць і 500 гадоў з выхаду першай беларускай друкаванай кнігі. Што робіцца ў рэгіёне для захавання традыцый і развіцця культуры?

— 500-годдзе беларускага кнігадрукавання — знакавы юбілей. Гэта вялікая дата не толькі для Беларусі, але і для сусветнай кніжнай гісторыі і культуры. У нашым горадзе, у друкарні Куцеінскага Свята-Богаяўленскага манастыра, яшчэ ў XVII стагоддзі знакамітым магілёўскім друкаром Спірыдонам Собалем таксама былі выдадзены дзясяткі ўнікальных царкоўных кніг тыражом у некалькі соцень экзэмпляраў. Сярод іх асаблівую вядомасць мае буквар («Букварь сиречъ, начало учения детям начинающим чтению извыкати. В Кутейне изобразися. В типографии Спиридона Соболя. Року 1631»), які сёння лічыцца адным з першых у гісторыі Беларусі падручнікаў. Захаваўся толькі адзін асобнік гэтай кнігі, які знаходзіцца ў фондах Нацыянальнага музея імя А. Шапціцкага ва ўкраінскім Львове. Перагаворы кіраўніцтва Оршы з адміністрацыяй гэтай установы пра атрыманне электроннага варыянта аўтэнтычнага старадруку прывялі да таго, што ў 2014 годзе падчас правядзення фестывалю «Беларусь праваслаўная» адбылася ўрачыстая прэзентацыя яго факсімільнай копіі.

Таму асветніцкія традыцыі, у прыватнасці кнігадрукарскія, маюць на нашай зямлі глыбокую гісторыю. У Беларусі і за яе межамі шырока вядомая выдавецкая дзейнасць мясцовых педагогаў, аўтараў шматлікіх дзіцячых выданняў Галіны і Сяргея Трафімавых, пяру якіх належыць «Аршанскі буквар», выдадзены ў 2014-м і перавыдадзены ў 2015-м. У гэтай кнізе кожная літара тлумачыцца праз выяву якой-небудзь са славутасцяў горада і раёна і аповед пра яе.

Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ. *lyskavets@zviazda.by*

■ Грошы

ПЕНСІЮ ВЫПЛАЦЯЦЬ ДА КАЛЯД

Пачалася датэрміновая выплата пенсій і дапамог за 7 студзеня.

Датэрміновая выплата пенсій (дапамог) за 7 студзеня ажыццяўляецца наступным чынам: пачынаючы з 4 студзеня — у аддзяленнях паштовай сувязі Брэсцкай, Віцебскай, Мінскай і Магілёўскай абласцей; пачынаючы з 5 студзеня — у аддзяленнях паштовай сувязі Гомельскай, Гродзенскай абласцей і Мінска. 7 студзеня будуць працаваць толькі дзяжурныя аддзяленні паштовай сувязі. Дадатковую інфармацыю аб рэжыме работы аддзяленняў паштовай сувязі ў краіне можна атрымаць па нумары 154.

Святлана БУСЬКО. *busko@zviazda.by*

ЗАРОБКІ БЮДЖЭТНІКАЎ КРЫХУ ПАДРАСТУЦЬ

Павысілася тарыфная стаўка першага разраду

З 1 студзеня гэтага года яе памер складае 31 рубель. Гэта прадугледжана пастановай Савета Міністраў ад 30 снежня 2016 года №1115. Устанавілі таксама штомесячныя дыферэнцаваныя даплаты работнікам бюджэтных арганізацый, якія тарыфікуюцца 1—14 разрадамі, у памерах 8,6—5,7 рубля.

Рэспубліканскім органам дзяржаўнага кіравання, мясцовым выканаўчым і распарадчым органам, кіраўнікам бюджэтных арганізацый неабходна будзе забяспечыць перараслік заробку работнікаў у адпаведнасці з новымі памерамі тарыфнай стаўкі першага разраду і штомесячных дыферэнцыраваных даплат.

Мінулы раз тарыфная стаўка першага разраду, ад якой залежаць заработныя платы бюджэтнікаў, павышалася ў леташнім красавіку — да 29,8 рубля.

Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ. *lubneuskaya@zviazda.by*

■

АРЫФМЕТЫКА АДУКАЦЫІ

Усе школы Магілёўшчыны ўключаны ў фінансавы эксперымент

Пілотны праект па апрабацыі нарматыўнага фінансавання ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі будзе пашыраны. Адпаведнае рашэнне змяшчаецца ў пастанове Савета Міністраў ад 29 снежня 2016 года №1109.

У рамках эксперымента аб'ёмы фінансавання, што накіроўваюцца на навучанне і выхаванне, «прывязваюцца» да колькасці навучэнцаў.

У 2017 годзе праект, па якім грошы «ідуць» за вучнем, будзе рэалізоўвацца ў Баранавічах, Брэсце, Віцебску, Жодзіне, Наваполацку, Скідалі і Фаніпалі, Бераставіцкім, Лідскім і Салігорскім раёнах, Савецкім і Цэнтральным раёнах Гомеля, Першамайскім раёне Мінска, а таксама на тэрыторыі ўсёй Магілёўскай вобласці.

У 2016 годзе ў ім прынялі ўдзел 186 устаноў агульнай сярэдняй адукацыі, якія ахопліваюць 127,3 тыс. школьнікаў. Плануецца, што сёлета ў яго будуць ўцягнутыя 642 установы агульнай сярэдняй адукацыі і 292,1 тыс. школьнікаў.

Новы механізм прадугледжвае фарміраванне бюджэту ўстановы на падставе сярэднегадавых паказчыкаў колькасці навучэнцаў розных катэгорый (па ступенях навучання, колькасці дзяцей з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця і колькасці вучняў, якія наведваюць групы падоўжанага дня), нарматыву бюджэтнай забяспечанасці выдаткаў і карэктуючых каэфіцыентаў.

У 2017 годзе базавы нарматыў на аднаго навучэнца складае 1284,66 рубля ў год для гарадскіх школ і 2862,16 рубля — для школ, размешчаных у сельскай мясцовасці. Мяркуецца, што новы механізм забяспечыць больш рацыянальнае выкарыстанне бюджэтных сродкаў, што ў выніку адаб'ецца і на заробках педагогаў.

Надзея НІКАЛАЕВА. *nikalaeva@zviazda.by*

■ Стыхія

ЦЫКЛОН AXEL: СІТУАЦЫЯ ПАД КАНТРОЛЕМ

У бліжэйшыя суткі снегавое покрыва ў краіне будзе павялічвацца, паведамляюць сіноптыкі.

Фота БЕЛТА.

А пакуль у сувязі з панежэннем тэмпературы паветра і выпадзеннем снегу работнікі МНС сумесна з прадстаўнікамі органаў улады і работнікамі суб'ектаў гаспадарання вядуць маніторынг сітуацыі, трымаюць руку «на пульсе» для аператыўнага рэагавання і аказання неадкладнай дапамогі ў выпадку якіх-небудзь здарэнняў.

Напрыклад, бліжэй да абеду ўчора ў прыбіранні снегу на дарогах Мінскай вобласці было задзейнічана 196 адзінак тэхнікі ЖКГ і 420 рабочых, 520 адзінак тэхнікі іншых міністэрстваў і ведамстваў і 556 рабочых. Да ўборкі снегу на вуліцах сталіцы было прыцягнута 417 адзінак тэхнікі. Дагэтуль, паводле інфармацыі «Гаррамаўтадара», каля 300 машын было выведзена на вуліцы Мінска ў начную змену. У выпадку неабходнасці ў любы момант можа быць задзейнічана дадатковая тэхніка. Пастаянна праводзілася апрацоўка дарожнага палатна процігалалёднымі сродкамі. Ачысткай пешаходных зон, прыпынкаў грамадскага транспарту, уваходаў у падземныя пешаходныя пераходы займаліся больш за 800 прыбіральшчыкаў тэрыторыі.

У Віцебскай вобласці дапамогу ў ачыстцы прыдамавых тэрыторый ад снегу гатовыя аказаць валанцёры БРСМ «Добрае сэрца». Для прыёму заявак у абласным маладзёжным камітэце створана «гарачая лінія». Просьбы аб дапамозе перадаюцца тэрытарыяльным падраздзяленням, якія шукаюць бліжэйшую брыгаду валанцёраў і накіроўваюць па адрасе заяўніка. А ў цэлым сітуацыя па вобласці была адносна спакойнай.

Ратавальнікі нагадваюць аўтаўладальнікам, што на дарогах неабходна быць вельмі ўважлівымі, асабліва ва ўмовах дрэннай бачнасці. Выбірайце мінімальную хуткасць руху і захоўвайце дыстанцыю паміж транспартнымі сродкамі. У выпадку пагаршэння ўмоў надвор'я варта зусім адмовіцца ад паездак. Калі мяцеліца заспела вас у дарозе, то спыніцеся каля населеных пунктаў, запраўчных станцый або ў любым месцы, дзе паблізу ёсць людзі, і перачакайце непагадзь. Памятайце, што аўтамабілі неабходна паркаваць такім чынам, каб яны не перашкаджалі працы снегаўборачнай тэхнікі.

Знаходзячыся на вуліцы, пазбягайце дрэў, якія стаяць паблізу, сцеражыцеся частак канструкцый і прадметаў, навіслых над будынкамі, абарваных правадоў ліній электраперадачы і іншых крыніц небяспекі. З сённяшняга дня пачынаецца значнае пахаладанне, таму варта засцерагчыся і ад марозу.

Сяргей РАСОЛЬКА. *rs@zviazda.by*

■

«Праваслаўны свет» — у падарунак

Беларуска-сербскія адносіны маюць выразны сяброўскі характар. І беларусаў, і сербаў аднолькава цікавяць складнікі духоўнага выхавання грамадства, маральнай трываласці нашых народаў. Пра гэта ішла гаворка і на сустрэчы беларускага пасла ў Сербіі Уладзіміра ЧУШАВА з Патрыярхам сербскім ІРЫНЕЕМ.

Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Беларусі ў Сербіі перадаў Патрыярху віншаванні нашага Прэзідэнта Аляксандра Лукашэнкі з Новым годам і Раством. А таксама ўручыў кіраўніку праваслаўнай царквы ў Сербіі ўнікальны альбом Выдавецкага дома «Звязда» — «Праваслаўны свет», дзе прадстаўлены абразы, што знаходзяцца ў калекцыях музеяў Беларусі, Расіі, Украіны.

У час сустрэчы былі абмеркаваны стан і перспектывы развіцця двухбаковага супрацоўніцтва ў гуманітарнай і духоўнай сферах. Падкрэслівалася неабходнасць захавання і ўмацавання духоўнамаральнага грунту дружбы паміж Беларуссю і Сербіяй.

Патрыярх Сербскі падзякаваў за атрыманне Сербскай праваслаўнай царквой фінансавых сродкаў у памеры 39 150 долараў ЗША, якія сабраны Беларускай праваслаўнай царквой для завяршэння будаўнічых работ у храме Святога Савы ў Белградзе. Ішла размова і пра магчымыя варыянты ўдзелу беларускага боку ў афармленні храма. Выказвалася меркаванне, што беларускія майстры змаглі б удзельнічаць у мазаічным афармленні купала і алтара храма ў складзе расійскай групы пад кіраўніцтвам акадэміка Расійскай акадэміі мастацтваў М. Мухіна. А таксама — у напісанні абразоў для афармлення храма.

Згадвалася і пра станоўчы вопыт стасункаў беларускіх і сербскіх кніжнікаў. Было адзначана, што існуе пагадненне Міністэрства інфармацыі і пасольства Беларусі ў Сербіі адносна правядзення ў Белградзе ў 2017 годзе «круглага стала» ў знак 500-годдзя беларускага кнігадрукавання.

Сяргей ШЫЧКО.

■ Камунальныя стасункі

ЁСЦЬ ЧАС ДА... СЁННЯ

Хто летась не паспеў аплаціць свае жыроўкі за лістапад, яшчэ можа аплаціць жыллёва-камунальныя паслугі без пені да 5 студзеня.

Аб гэтым гаворыцца ў пастанове ўрада №946, дзе прапісана, што да 5 студзеня вызначаны нулявы памер пені за нясвоечасова або не ў поўным аб'ёме аплачаныя жыллёва-камунальныя паслугі (ЖКП) за лістапад. Такая часовая палёгка спажыўцам ЖКП была звязана з пераходам на сістэму аплаты праз АІС «Разлік-ЖКП». А вось за наступныя дні неаплаты будзе налічвацца пеня ў памеры 0,3% ад сумы за кожны дзень. Традыцыйна аплачваць камунальныя паслугі неабходна да 25 чысла месяца.

Сяргей КУРКАЧ. *kurkach@zviazda.by*

■

■ Класныя навіны

МАЙСТЭРСТВА НАСТАЎНІКА — НЕ ВЫПАДКОВАЯ ЎДАЧА

Больш як чатыры сотні педагогаў з усёй краіны сталі ўдзельнікамі VI Рэспубліканскага Каляднага фестывалю педагагічнага майстэрства, які адкрыўся ўчора ў Мінску. Ініцыятыва яго правядзення належыць Акадэміі паслядыпломнай адукацыі і Беларускаму педагагічнаму таварыству.

— На свеце няма больш маральна-арыентаванай, адказнай і шматграннай прафесіі, чым прафесія педагога. Сярод яе прадстаўнікоў, якіх называюць лепшымі з лепшых, ёсць традыцыя — вучыць не толькі сваіх вучняў, але і шчодра дзяліцца сваім досведам і сваімі ідэямі з калегамі,— падкрэслівае **рэктар акадэміі, кандыдат фізіка-матэматычных навук Андрэй МАНАСТЫРНЫ**. — Майстэрства настаўніка — не выпадковая ўдача і не шчаслівая знаходка, а сістэматычная карпатлівая праца, пастаянныя пошукі і спробы самаўдасканалення...

Сёння мы кажам пра тое, што кожны ўрок павінен праходзіць у атмасферы інтэлектуальных, маральных і эстэтычных хваляванняў, сутыкненняў розных пунктаў погляду і меркаванняў, пошуку праўды і магчымых шляхоў вырашэння праблемы. І няважна, які прадмет выкладае настаўнік: галоўнае — якія ўмовы ён стварае на сваіх уроках для гарманічнага выхавання асобы.

На думку Андрэя Манастырнага, выхаваўчы патэнцыял урока ў многім залежыць ад прафесіяналізму педагога: ці з'яўляецца той для дзіцяці аўтарытэтам, ці стварае на сваіх уроках умовы для развіцця і пакарэння новых вышынь?

Ён падкрэслівае, што сёння настаўнікам стала намнога складаней працаваць з бацькамі вучняў, і справа не толькі ў тым, што аўтарытэт педагога як самага кампетэнтнага чалавека, як адзінай крыніцы ведаў ужо не абсалютны. Важнай праблемай стала разыходжанне ідэалаў у сям'і і школы: для чаго трэба вучыцца, што дадуць тыя ці іншыя веды і навыкі, якія мэты трэба ставіць перад сабой? Сям'я нярэдка імкнецца прывіць дзіцяці вельмі вузкапрагматычныя, матэрыяльныя і кар'ерысцкія ўстаноўкі...

Усяго на фестывалі запланавана правядзенне 77 майстар-класаў, педагагічных студый, урокаў для дарослых, практыкумаў, інтэрактыўных перапынкаў і іншых мерапрыемстваў, якія праводзяць члены Асацыяцыі настаўнікаў-метадыстаў «Імкненне» і клуба «Крыштальны журавель».

Надзея НІКАЛАЕВА. *nikalaeva@zviazda.by*

■

■ На слыху

Па факце нападу на міліцыянера заведзена крымінальная справа

Пра гэта паведаміў афіцыйны прадстаўнік ГУУС Мінгарвыканкама Аляксандр ЛАСТОЎСКІ. Нагадаем, 1 студзеня ў 6.40 раніцы па спецлініі «102» патэлефанавалі і паведамілі пра тое, што ў адной з кватэр жылога дома па сталічным праспекце Любімава шумяць, перашкаджаюць адпачываць. Па адрасе быў накіраваны супрацоўнік гарадскога аддзела міліцыі №2. Справа скончылася стралянінай, а ў сецівe пачалося абмеркаванне таго, што здарылася...

Прыбыўшы па адрасе, сяржант С. пачуў гучны шум. На званок дзверы адчыніў грамадзянін Г. Супрацоўнік міліцыі прадставіўся, растлумачыў прычыну візіту, папрасіў не перашкаджаць суседзям адпачываць. У адказ грамадзянін Г., які знаходзіўся ў стане моцнага алкагольнага ап'янення, раптам нанёс удар супрацоўніку міліцыі ў вобласць грудзей, пасля чаго яшчэ серыю ўдараў у галаву, а затым паспрабаваў завалодаць табельнай зброяй міліцыянера, прыводзіць словы Аляксандра Ластоўскага сайт ГУУС Мінгарвыканкама.

Аднак супрацоўнік міліцыі папярэдзіў грамадзяніна аб прымяненні табельнай зброі, калі той не спыніць свае супрацьпраўныя дзеянні. Але дарэмна: правапарушальнік схапіўся за запясце міліцыянера і спрабаваў вырваць пісталет. У выніку сяржант міліцыі ў час барацьбы зрабіў папераджальны стрэл убок, а потым яшчэ два стрэлы, імкнучыся прычыніць нападніку найменшую шкоду. Пасля гэтага правапарушальнік быў затрыманы і дастаўлены ва ўстанову аховы здароўя на лячэнне: у яго два скразныя раненні ў вобласці грудзей і левай ступні. Супрацоўнік міліцыі быў шпіталізаваны з чэрапна-мазгавой траўмай і іншымі пашкоджаннямі.

Пацярпелы супрацоўнік характарызуецца станоўча

Па гэтым факце заведзена крымінальная справа па артыкуле 363 Крымінальнага кодэкса за супраціўленне супрацоўніку органаў унутраных спраў або іншай асобе, якія ахоўваюць правапарадак.

Пасля здарэння з'явілася інфармацыя, што быццам бы супрацоўнік міліцыі адразу пасля інцыдэнту з выкарыстаннем табельнай зброі пакінуў месца здарэння. Міліцыя абвергла чутку, заявіўшы, што сяржант, знаходзячыся ў пад'ездзе дома, тут жа паведаміў пра тое, што адбылося, сказаў пра неабходнасць шпіталізацыі пацярпелага і папрасіў дапамогу. Апошняя была па названым адрасе праз некалькі хвілін. Супрацоўнік міліцыі характарызуецца станоўча, ён вытрыманы, спакойны, ураўнаважаны, канфліктных сітуацый імкнецца пазбягаць.

Па факце здарэння праводзяцца следчыя дзеянні.

Сяргей РАСОЛЬКА. *rs@zviazda.by*

■

АВАРЫЙНЫЯ БУДЫНКІ ЦІ ГІСТАРЫЧНАЯ СПАДЧЫНА?

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Упершыню аб нязручным размяшчэнні квартала загаварылі ўжо ў 1970-я. Тады горадабудаўнікі хацелі, але не змаглі пашырыць вуліцу Горкага (цяперашнюю — Багдановіча). Да пытання аб мэтазгоднасці захавання двухпавярховых будынкаў у цэнтры сталіцы вярнуліся ў канцы 1990-х і яшчэ раз у 2000-х. Апошняя, пакуль незавершаная спрэчка зацікаўленых бакоў — горада і жыхароў раёна — пачалася два з лішнім гады назад.

Козыр горада — экспертнае меркаванне спецыялістаў-будаўнікоў, якія сцвярджаюць, што амартызацыйны тэрмін эксплуатацыі падобных будынкаў 50 гадоў, такім чынам, іх ужо трэба было знесці. Прычым, не лепшы стан жылога фонду прыносіць нязручнасці, у першую чаргу, самім жа насельнікам раёна. Але ініцыятыўныя гараджане ўпэўненыя, што квартал з'яўляецца ўнікальным у сваім родзе і пры правільным падыходзе можа зрабіць Мінск больш прывабным для турыстаў.

Раён будаваўся з перспектывай доўгага існавання: першапачаткова двары і тратуары былі выкладзеныя даўгавечным брукам, а дахі накрытыя чарапіцай.

Гэтай восенню мясцовыя жыхары сабралі больш за 350 подпісаў пад зваротам у Міністэрства культуры з просьбай надаць кварталу статус гісторыка-культурнай каштоўнасці. Раней з падобнай ініцыятывай у Мінкульт звярнулася грамадская арганізацыя «Гісторыка».

Канчатковае рашэнне яшчэ не вынесена, аднак праект на выпадак зносу раёна ўжо існуе. Апублікаваны летась новы генплан Мінска прадугледжвае, што вуліца Багдановіча (паралельная праспекту Незалежнасці) усё ж такі праз 40 гадоў будзе рэканструявана, пашырана для таго, каб разгрузіць цэнтральную магістраль. Прапануецца павялічыць шырыню праезнай часткі дарогі да пяці палос. А на месцы двухпавярховак павінен з'явіцца новы жылы комплекс.

Момант прыняцця рашэння па лёсе раёна быў адкладзены па аб'ектыўных прычынах: зараз Мінгарвыканкам сумесна з ініцыятыўнымі грамадскімі дзеячамі распрацоўвае менеджмент-план, які дазволіць вызначыць перспектывы захавання і развіцця гэтай тэрыторыі ў тым выглядзе, у якім яна існуе цяпер.

Краевугольным каменем з'яўляецца тое, што калі раёну ўсё ж будзе прысвоены статус гісторыка-культурнай каштоўнасці, то рэканструяваць і нават рамантаваць жылыя будынкі стане праблематычна: любыя змены ў іх абліччы трэба будзе ўзгадняць не ў адной інстанцыі. Нельга адмаўляць, што многія будынкі маюць вострую патрэбу ў капітальным дарагім рамонце ўжо зараз. І ўзнікае пытанне: ці сапраўды «барацьба» выкліканая іх рэальнай каштоўнасцю, а не нежаданнем жыхароў расставацца з асабістымі настальгічнымі ўспамінамі дзяцінства і юнацтва?

Калі раён усё ж захаваюць, то з цягам часу ён з жылога ператворыцца ў культурна-забаўляльны. Але такім чынам сталіца мала таго, што пазбавіцца ўжо існуючага жылога фонду, дык яшчэ і страціць тэрыторыі, на якіх маглі б з'явіцца так патрэбныя мінчанам новыя камфартабельныя шматкватэрныя дамы. Менавіта таму ў праекта ёсць і праціўнікі: складана растлумачыць тым, хто чакае сваёй чаргі на кватэру дзесяцігоддзі, чаму важна захаваць нерацыянальныя двухпавярхоўкі ў цэнтры горада.

Аднак жыхары Асмалоўкі з такім меркаваннем не згодны: яны лічаць, што жылую і культурную функцыі можна паспяхова аб'яднаць. Добра, вопыт такі ўжо ёсць: у сярэдзіне мінулага стагоддзя ўсе святы тут адзначалі цэлым кварталам. Летась традыцыі пастараліся адрадзіць, так былі праведзены калядны, масленічны і велікодны фэсты, фестывалі суседзяў і варэння, свята-конкурс «Кошкі на акенцы», публічны майстар-клас па ўліку дрэў, сумеснымі намаганнямі была распісана трансфарматарная будка.

Яшчэ адна прычына, па якой актывісты змагаюцца за Асмалоўку, — гэта тое, што раён з'яўляецца адным з самых зялёных у горадзе. Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя накіравала ў Мінкульт ліст пра важнасць захавання зялёных тэрыторый гэтага квартала. Па падліках эколагаў, для стварэння такой жа зялёнай зоны спатрэбіцца мінімум 70 гадоў. Паспеюць вырасці два пакаленні, а калі ўлічыць, што ва ўмовах дэфіцыту азелянення ў Мінску ўжо пражывае каля 275 тысяч чалавек... Але што да гэтага тым, у каго другое пакаленне гадуецца ў пакоі інтэрната? Вось і ўгадай, чыя праўда праўдзівейшая...

Безаблічныя функцыянальныя шматпавярхоўкі або ўтульныя двары Сельгаспасёлка?

Не атрымалася пазбегнуць канфліктнай сітуацыі і жыхарам так званага Сельгаспасёлка Савецкага раёна сталіцы. Для горада, які імкліва развіваецца, такі велізарны ўчастак, заняты прыватным сектарам, стаў сур'ёзнай праблемай.

У цэнтры ўвагі, як і ў выпадку з Асмалоўкай, — усё тая ж вуліца Багдановіча (далей, у бок Зялёнага Луга). Недастаткова шырокая магістраль не спраўляецца з інтэнсіўным транспартным патокам. Да таго ж у перспектыве тут павінна прайсці новая лінія метро, пачатак будаўніцтва якой запланаваны аж на 2025 год, таксама, хутчэй за ўсё тут будзе закладзена развязка трэцяга транспартнага кальца. Тым не менш жыхары раёна катэгарычна супраць зносу сваіх дамоў.

Яшчэ генплан Мінска 1982 года, які атрымаў, дарэчы, прэмію Савета Міністраў, прадугледжваў ліквідацыю гэтай малапавярховай забудовы. Тады раён не знеслі — у хуткім часе пачалася перабудова ва ўсёй краіне, рукі да перабудовы асобна ўзятага пасёлка не дайшлі. Але ў 2010 годзе рашэнне аб кардынальных зменах было прынята канчаткова. Да будаўнічых работ доўгі час справа не даходзіла, і, калі да спрэчнага пытання вярнуліся, паднялася хваля пратэстаў сярод мясцовых жыхароў. Вырашана было перагледзець праект, каб па магчымасці захаваць максімальную колькасць дамоў. У выніку пад знос павінны пайсці 614 прыватных дамоў, застанецца толькі 281.

Актывісты накіравалі ў адміністрацыю Савецкага раёна дзесяцістаронкавы дакумент, які змяшчае ў сабе шматлікія каментарыі па праекце. Пакуль ніякія будаўнічыя работы на тэрыторыі Сельгаспасёлка не пачаліся, але, нягледзячы на пратэсты, захаваць яго ў цяперашнім выглядзе дакладна не атрымаецца.

Да 2030 года, паводле генплана, аблічча раёна павінна кардынальна змяніцца: новыя жылыя комплексы, шматфункцыянальныя цэнтры, паліклініка, дзіцячыя сады і школы. Але больш ніякіх утульных двароў і вузкіх вулачак, якія мімаволі нагадваюць кранальныя вясковыя. Аднак такую «раскошу» не можа дазволіць сабе ні адзін буйны горад: вёска вёскай, а мегаполіс павінен развівацца па іншых правілах.

* * *

А вось пра тое, як грамадскае меркаванне ўплывае на аблічча горада, красамоўна кажа гісторыя парка Котаўка, які размяшчаецца ў тым жа раёне. Выпадак з самага пачатку хутчэй нетыповы, бо на тэрыторыі парку збіраліся будаваць не жыллё, а культавы будынак. Супраць выказаліся эколагі і неабыякавыя мясцовыя жыхары. Яны лічаць азеляненне раёна і так нездавальняльным, а дадатковая высечка дрэў магла б зрабіць сітуацыю крытычнай. Тым не менш у пачатку снежня ў парку пачалі праводзіць падрыхтоўку да будаўнічых работ.

Аднак насустрач тэхніцы «Мінскзелянбуда» «з боем» выйшлі мясцовыя жыхары. Супрацьстаянне працягвалася дзевяць гадзін, пасля чаго работы былі прыпыненыя. На днях стала вядома, што ўзводзіць храм у парку ўсё ж такі не будуць. Старшыня Мінгарвыканкама Андрэй Шорац прапанаваў грамадскім арганізацыям і актывістам, якія выступалі за захаванне дрэў, прыняць удзел у азеляненні сквера.

Дар'я КАСКО.
kasko@zviazda.by

■ Смачна есці!

КАБ ГРАМАДСКАЕ БЫЛО ЯК ХАТНЯЕ,

ці Як прывіць беларусам звычку снедаць у кавярнях

У маі 2016 года распараджэннем прэм'ер-міністра была створана міжведамасная рабочая група на чале з міністрам антыманапольнага рэгулявання і гандлю Уладзімірам Калтовічам для выпрацоўкі прапаноў па ўдасканаленні арганізацыі грамадскага харчавання. Перад ёй была пастаўлена задача прааналізаваць умовы ажыццяўлення гаспадарчай дзейнасці ў гэтай сферы. Якія праблемныя пытанні ў арганізацыі грамадскага харчавання былі выяўлены? Якія фактары, на думку экспертнай супольнасці, стрымліваюць развіццё гэтага сегменту спажывецкага рынку і што неабходна зрабіць, каб іх нівеліраваць? Гэтыя і іншыя актуальныя пытанні развіцця сферы грамадскага харчавання абмеркавалі эксперты падчас «круглага стала» ў БЕЛТА. Прапануем чытачам найбольш цікавыя, на наш погляд, адказы на пытанні намесніка міністра антыманапольнага рэгулявання і гандлю Ірыны НАРКЕВІЧ.

Улічыць прапановы ўсіх бакоў

— Паўгода таму была створана міжведамасная рабочая група па грамадскім харчаванні. Якіх вынікаў удалося дабіцца за час яе працы?

— Рынак развіваецца. На пэўным этапе трэба было прымяняць жорсткае рэгуляванне. Але час ідзе, і цяпер гэта ўжо не патрабуецца. Першыя крокі па лібералізацыі былі зроблены ў 2009 годзе. Цяпер настаў другі этап, і гэта своечасова.

«Сёння рынак сфарміраваўся, бізнес аналізуе пакупніцкі попыт, сусветныя тэндэнцыі і разумее, які асартымент будзе запатрабаваны».

Міністэрства пачало з сябе: мы сталі апускаць планку сваіх нарматываў. Падрыхтаваны і ўнесены ў Міністэрства юстыцыі змяненні ў Правілы гандлю. У прыватнасці, мяркуецца, што наведвальнікам будзе дадзена магчымасць прынесці з сабой харчовую прадукцыю і тавары, за выключэннем забароненых да выкарыстання. Але, безумоўна, з дазволу адміністрацыі аб'екта грамадскага харчавання. Зараз гэтая норма не ўрэгулявана. Вядома, наўрад ці можна будзе прынесці ў рэстаран ежу ўласнага прыгатавання, але, напрыклад, выпечаны ў кандытарскай святочны торт — чаму і не?

«На пэўным этапе трэба было прымяняць жорсткае рэгуляванне. Але час ідзе, і цяпер гэта ўжо не патрабуецца».

З нядаўняга часу суб'ектам дадзена права цалкам самастойна вызначаць асартыментную палітыку аб'екта, яго спецыялізацыю. Бізнесмены выступалі за самастойнае фарміраванне асартыменту, абапіраючыся на веданне пакупніцкага попыту. Пытанне дыскусійнае, але надышоў час, калі рэгуляванне тут не патрэбна. У свой час была высокая рызыка ўсім рэстаранам ператварыцца ў прадпрыемствы, якія прапануюць фаст-фуд. Каб гэтага пазбегнуць, была ўведзена класіфікацыя. Сёння рынак сфарміраваўся, бізнес аналізуе пакупніцкі попыт, сусветныя тэндэнцыі і разумее, які асартымент будзе запатрабаваны.

Стаўка — на нацыянальнае

— Якіх змен чакаць у сферы рэгулявання грамадскага харчавання ў бліжэйшы час?

— Каб яна больш актыўна развівалася, недастаткова толькі нарматыўна-прававых рашэнняў. Трэба прывіваць культуру паводзінаў. Беларусы не прывыклі снедаць і абедаць у рэстаранах, кавярнях. Хоць, напрыклад, ланчы ў многіх установах па досыць прымальным кошце. Зноў-такі, кубак кавы выпіць, пасядзець.

Асаблівая ўвага — нацыянальнай кухні. Зараз на выпуску такіх страў спецыялізуюцца 229 рэстаранаў, кавярняў, бараў. У 2016 годзе за кошт новага будаўніцтва, пераспецыялізацыі адкрыта 9 нацыянальных устаноў (у 2015 годзе — 49). Праводзяцца дні беларускай кухні, выставы-продажы і дэгустацыі, майстар-класы па прыгатаванні страў. У Мінску традыцыйным стаў Тыдзень беларускай кухні, калі ў рэстаранах і кавярнях прапануюцца стравы, прыгатаваныя па адзіных тэхналагічных дакументах (рэцэптурах) і аднолькавых цэнах, незалежна ад тыпу і класа аб'екта. У сувязі з гэтым трэба казаць і пра турыстычны патэнцыял краіны. Вядома, мы за спрашчэнне візавага рэжыму. Гэта будзе спрыяць таму, каб рэстаранны бізнес развіваўся, у тым ліку побач з гістарычнымі і культурнымі аб'ектамі. У бізнесу шмат прапаноў. І мы павінны чуць усё без выключэння. Прычым не проста чуць, а дапамагаць. Як кажа кіраўнік дзяржавы, зрабіце празрыстымі правілы гульні і не чапайце, хай яны развіваюцца. Гэта пытанне комплекснае, і мы будзем гэтым займацца.

Сяргей РАСОЛЬКА.
rs@zviazda.by

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена

5 СТУДЗЕНЯ 2017 г.
ЧАЦВЕР
№ 1 (15808)

Выдаецца з 21 красавіка 1921 года

Імёны

Артур МАЦВЕЕНКА:

«У маёй працы карысны нават малаток»

Музыка ў фільмах і гульнях — неад'емны складнік. Пагадзіцеся, без мелодый, песень кіно было б вельмі сумна глядзець, а без эпічнай музыкі — блукаць бясконцымі сцежкамі камп'ютарных гульняў. Сённяшні наш суразмоўца, кампазітар, аўтар музычнага праекта Dzivia Артур Мацвеенка дакладна ведае, як скласці гукавы «партрэт» героя гульні, які саўндтрэк напісаць для кіно ці рэкламнага ролика. І дзеля патрэбных мелодый ён не баіцца нават правесці ноч у лесе. Некаторыя сакрэты сваёй незвычайнай прафесіі Артур раскрывае ў гутарцы з карэспандэнтам «Чырвонкі. Чырвонай змены».

— Прафесія кампазітара цяпер досыць рэдкая. Тым больш — сярод моладзі. Чаму ты выбраў для сябе такі шлях?

— Усё пачалося выпадкова, аднойчы проста пачаў пісаць музыку. Натуральна, я маю адукацыю: скончыў музычную школу па класе кларнета і саксафона. Але пасля яе заканчэння я гады тры не іграў на інструменце, а потым у пэўны момант пачаў ствараць музыку. Сапраўды, наша прафесія досыць рэдкая, але, можна сказаць, запатрабаваная на міжнародным рынку. Магчыма, прычына такой нераспаўсюджанасці кампазітарскай справы ў тым, што ў Беларусі няма навучальных устаноў, дзе даюць патрэбную адукацыю. Я маю на ўвазе — навучаюць кампазітараў, якія пішуць неакадэмічную музыку для фільмаў і гульняў. Так, у нас ёсць акадэмія музыкі, але там выкладаюць зусім іншае. Мне ж трэба ведаць фізіку гуку, умець карыстацца эквалайзерамі, кампрэсарамі. Гэта ўсё даецца далёка не адразу.

(Заканчэнне на 8-й стар. «ЧЗ».)

Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

Цёплае месца

МІЛЬЁН ПУНСОВЫХ РУЖ,

або Каго не здзівіш гэтай кветкай

Нават самай глыбокай зімой, у самыя моцныя маразы ў вёсцы Багатырова, што пад Мінскам, ёсць месца, дзе клімат заўсёды блізкі да субтрапічнага. І справа зусім не ў надвор'і — менавіта тут супрацоўнікі агракамбіната «Ждановічы» вырошчваюць ружы для ўсёй краіны. Карэспандэнты «Чырвонкі. Чырвонай змены» наведалі незвычайную вытворчасць і пазнаёміліся з маладымі работніцамі цяплічнага камбіната «Багатырова».

У складзе комплексу знаходзіцца адразу некалькі цяпліц: у большасці вырошчваюць агародніну, пераважна агуркі і таматы. Пад кветкі тут адведзена толькі адно памяшканне, але плошча яго ўражвае: больш як два гектары. Палову займае самы папулярны сорт — чырвоная ружа Red Naomi, астатняе падзелена паміж яшчэ адзінаццаццю сартамі кветкі. Гэта, напрыклад, White Naomi белага колеру, Sweet Avalanche ружовага, Peach Avalanche персікавага — усяго больш за 150 тысяч кустоў.

Майстар брыгады №5 Дзіяна ГРЫШКІНА родам з Мінска, пасля школы паступіла ў каледж бізнесу і права, дзе атрымлівала адукацыю эканаміста. Упершыню ў агракамбінат прыйшла яшчэ ў 18 гадоў — праходзіць практыку. Спачатку працавала на базе, потым займалася ўлікам прадукцыі на адным са складоў, а ў 2014-м перайшла ў навастворaны цяплічны камбінат. Работа за межамі кальцавой праблемы не стварыла — усіх супрацоўнікаў прывозяць сюды і развозяць па дамах у аўтобусе.

— У мае абавязкі ўваходзіць налічэнне заработнай платы, таму я пераважна сачу за аб'ёмамі працы, якую выконваюць спецыялісты брыгады, а таксама кантралюю яе якасць, — дзеліцца спецыяліст. — Заработная плата ва ўсіх здзельная, таму яе памер цалкам залежыць ад таго, як чалавек працаваў. Налічваю заробак таксама я, так бы мовіць, майстар і бухгалтар у адной асобе. Хоць непасрэдна з кветкамі не працую, але пра тэхналогію вырошчвання руж ведаю ці не ўсё.

(Заканчэнне на 5-й стар. «ЧЗ».)

Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

Дзіяна Грышкіна кантралюе работу ўсёй брыгады цяплічнага камбіната.

Сваім розумам

Настаўнік і вучань: што ў ідэале?

Чаму гісторыя і літаратура — не лішнія прадметы ў школе

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

«Школа будучыні вачыма навучэнцаў» — дэбаты на гэту тэму прайшлі ў Нацыянальным інстытуце адукацыі з удзелам адзінаццацікласнікаў 43-й сталічнай гімназіі. У цэнтры ўвагі аказаліся плюсы і мінусы сучаснай школы. Без пяці хвілін выпускнікі разважалі пра тое, якімі павінны быць ідэальны настаўнік і ідэальны вучань, ці ёсць будучыня ў кніг на папяровых носьбітах і ў якую школу яны б хацелі прывесці сваё дзіця.

— Нам падалося цікавым запрасіць да дыскусіі менавіта юнакоў і дзяўчат, якім засталося ўсяго паўгода да самастойнага дарослага жыцця, бо гэта ўжо людзі з крытычным мысленнем і сваёй пазіцыяй, якую яны могуць аргументаваць і гатовы яе адстойваць, — растлумачыў выкладчык Інстытута журналістыкі БДУ кандыдат філалагічных навук дацэнт Уладзімір КАПЦАЎ.

ІНСТРУМЕНТ ДЛЯ ВЫХАВАННЯ

— Самы вялікі мінус нашай школы — гэта яе вучэбная праграма, якая вельмі павярхоўна закранае змест вялікай колькасці вучэбных дысцыплін, прычым тыя веды, што мы атрымліваем на школьных уроках, магчыма, у будучыні нам увогуле не спатрэбяцца.

(Заканчэнне на 2-й стар. «ЧЗ».)

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена
5 01 2017 г.

Абмяркуем!

ДА МОВЫ — ПРАЗ ГУЛЬНІ

Прапанова вывучаць беларускую мову праз камп'ютарныя гульні прагучала ад моладзі на першым пасяджэнні абласнога клуба «Адкрыты дыялог», дзе абмяркоўваліся пытанні папулярызацыі нацыянальнай культуры. Пра гэта нам расказалі прадстаўнікі Гродзенскага абласнога камітэта БРСМ.

У сценах Новага замка сабраліся эксперты розных узростаў — заслужаныя дзеячы мастацтваў, рэжысёры, тэлевядучыя, прадстаўнікі грамадскіх аб'яднанняў, творчыя маладыя людзі, юныя навукоўцы. У форме адкрытага дыялогу ўдзельнікі выказалі меркаванні пра асаблівасці сучаснай беларускай культуры, ролю нацыянальных традыцый у сучасным грамадстве, падзяліліся сваім бачаннем праблем маладзёжнай культуры. Сярод агучаных прапаноў — пераклад камп'ютарных гульняў на беларускую мову. Такія гульні і праграмы можна было б больш актыўна выкарыстоўваць у адукацыйным працэсе ў школах.

Таксама эксперты прапанавалі правесці ў Гродзенскай вобласці ў 2017 годзе Тыдзень беларускай мовы: прапанаваць размаўляць у дзяржустановах выключна на ёй, а ў кнігарнях зрабіць зніжкі беларускамоўным пакупнікам. Прапанавана правесці абласны фестываль фальклорнай маладзёжнай творчасці і папулярызаваць нацыянальную культуру сярод моладзі праз вышыванку.

Ініцыятарам стварэння абласнога клуба «Адкрыты дыялог» з'яўляецца Гродзенскі абласны камітэт БРСМ. Клуб з'явіўся ў працяг развіцця аднайменнага рэспубліканскага праекта, які стартаваў у 2014 годзе. Чакаецца, што абласны клуб стане добрай платформай для арганізацыі дыялогу моладзі з прадстаўнікамі органаў улады, палітыкамі, прадпрымальнікамі, грамадскімі дзеячамі па найбольш актуальных тэмах. Задача такой формы работы — сканцэнтраваць увагу моладзі на найважнейшых пытаннях грамадска-палітычнага жыцця краіны, нацэліць іх на пазітыўнае і канструктыўнае мысленне.

Настаўнік і вучань: што ў ідэале?

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)

— Для прыкладу, я навучаюся ў профільным фізіка-матэматычным класе, але, нягледзячы на гэта, шмат увагі вымушаны выдаткоўваць на тыя прадметы, якія не будуць запатрабаваныя пасля школы. Адкуль у мяне такая ўпэўненасць? Я праведу дастаткова часу за вывучэннем таго, якія веды патрабуюцца для маёй будучай прафесіі. Да таго ж у маім акружэнні ёсць людзі, якія ў гэтай сферы ўжо працуюць: яны пацвердзілі, што большасць прадметаў, якія я сёння вымушаны вывучаць, ім не спатрэбілася, прычым не толькі ў рабоце, але і падчас навучання ў ВНУ. Фізіка-матэматычны профіль на старшай ступені школы забяспечвае выбар з дастаткова вялікай колькасці спецыяльнасцяў. Асабіста я збіраюся ісці ў сферу ІТ. На маё пытанне «навошта мне здаваць на ўступным экзамене фізіку і ўвогуле навошта фізіка для вэб-распрацовак?» школьны настаўнік адказаць не змог. Аргумент «для таго, каб ведаць, як працуе камп'ютар», прыняць не магу, бо яго ўстройства ведаю ўжо даўно.

«А вось падручнікі дакладна чакае электронная будучыня, таму што значна прасцей змяніць яго змест у электронным выглядзе, а не друкаваць кожны год новы...»

павінен быць добрым, літаральна лепшым сябрам, не патрабаваць шмат і не скардзіцца на цябе бацькам. Але, насамрэч, ніякай карысці ад такога педагога не будзе, таму што нельга вучыць, не патрабуючы. Педагог павінен бачыць аддачу ад сваёй працы, — лічыць адзінаццацікласніца **Наталля КІЗІНО**. — У малодшых класах мала хто настроены сядзець 45 хвілін на адным месцы, уважліва слухаць і запамінаць, таму, каб завалодаць увагай дзіцяці, педагогу трэба прыкласці шмат намаганняў. Але з узростам жаданне слухаць на ўроку нават цікавыя факты, на жаль, знікае. У 10-м класе хочацца атрымліваць як мага больш інфармацыі, якая спатрэбіцца табе для паступлення, а тым больш у 11-м класе, калі на носе выпускныя і ўступныя іспыты. І тады лепшым настаўнікам для цябе становіцца той, хто дакладна і даступна выкладае карысную інфармацыю, хто можа параіць, што трэба вучыць цяпер, а што можна адкласці на заўтра, што трэба вывучыць дасканала, а дзе дастаткова павярхоўных ведаў. Той педагог, які дапаможа табе падрыхтавацца да паступлення, і стане для цябе найлепшым. І ўсё ж такі сярод вялікай колькасці настаўнікаў, з якімі даводзіцца сустракацца за адзінаццаць гадоў вучобы, абавязкова ёсць тыя, хто застаецца ў памяці на ўсё жыццё: настаўнікі, якія неяк па-асабліваму праводзілі свае ўрокі, умелі завалодаць даверам і павагай сваіх вучняў. Але іх у школе зусім няшмат.

Настаўнік, а не рэпетытар

Наталля Кізіно лічыць, што друкаваная кніга не знікне хоць бы таму, што яна мае пэўныя перавагі перад электронным аналагам: «У папяровым экзэмпляры заўсёды можна пазначыць важны для цябе момант ці кавалак тэксту, да якога потым лёгка можна вярнуцца. У электронным тэксце зрабіць гэта больш праблематычна. А вось падручнікі дакладна чакае электронная будучыня, таму што значна прасцей змяніць яго змест у электронным выглядзе, а не друкаваць кожны год новы...»

Цікава было пачуць, як **адзінаццацікласнікі ўяўляюць сабе школу праз 10—15 гадоў. Што там павінна змяніцца, каб ім захацелася туды прывесці сваё дзіця?** Бліц-апытанне, і не больш як 10—15 секунд на адказ кожнаму:

— Я аддаў бы сваё дзіця ў школу, дзе працуе ідэальны настаўнік... А калі сур'ёзна, то ў школу, дзе яно мела б права выбару, дзе дзіця заўсёды выслухаюць і дапамогуць...

— Я хацеў бы, каб у школе была вузкая спецыялізацыя і можна было б выбіраць тыя прадметы, што спатрэбяцца ў будучыні. Плюс каб у школе навучанне адбывалася з выкарыстаннем шырокага спектра інфармацыйных тэхналогій...

— Добрай я лічу тую школу, якая дапаможа дзіцяці раскрыць свой патэнцыял...

— А я бы аддала сваё дзіця ў тую школу, якую скончыла сама, бо лічу, што яно павінна прайсці маім шляхам праз тыя ж выпрабаванні...

— Сучасная школа не дае ведаў для паступлення, таму ўсе аднакласнікі займаюцца дадаткова з рэпетытарамі. Таму я адвяла б дзіця ў тую школу, дзе ўсе патрэбныя веды будуць даваць на школьных уроках...

— А я бы аддала сваё дзіця ў самую звычайную школу, але з добрымі педагогамі, таму што ўсё насамрэч залежыць ад настаўнікаў...

— ...у тую школу, дзе настаўнікі жадаюць навучыць і ўмеюць гэта рабіць. У школу, дзе паміж педагогамі і вучнямі складваюцца добрыя адносіны...

Заўсёды вучыцца ў вучняў

Вынікі дыскусіі падагульніла **заслужаны работнік адукацыі Рэспублікі Беларусь, педагог-метадыст вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі Акадэміі паслядыпломнай адукацыі Ганна ДАБРЫНЕЎСКАЯ.**

— У маім жыцці было шмат і вучняў, і настаўнікаў, прычым вельмі розных. Якой жа я сёння, маючы за плячыма 55 гадоў прафесійнага стажу, бачу школу будучыні? Мне падаецца, што гэта павінна быць школа разумнага балансу паміж кнігамі і тэхнікай, паміж настаўнікамі і вучнямі, паміж мінулым і будучыняй. Што мне вельмі імпануе, дык гэта ваша актыўная пазіцыя, вашы выказванні пра маральнасць, бо ніякая праца не мае сэнсу, калі няма маральнай асновы, даверных адносін, дэмакратычнасці, адкрытасці і шчырасці ў стасунках.

«Літаратура — вельмі сур'ёзны інструмент для фарміравання асобы, таксама як і мова, і гісторыя».

Якім я бачу ідэальнага вучня? Гэта той, хто не будзе чакаць, што ад яго запатрабуе настаўнік. Школа патрабаванняў — школа ўчарашняга дня. Сёння патрэбная іншая школа: тая, дзе вучань вучыцца сам. У вашы гады трэба мець бачанне будучыні. Прагнастычная кампетэнцыя вельмі важная, як і ўменне вучыцца. Чалавек будзе вучыцца сам, калі яго гэтаму навучаць, а гэта ўжо місія настаўніка. Якім жа я бачу ідэальнага настаўніка? Гэта той, хто дапаможа кожнаму вучню стаць самім сабой, знайсці сваё месца ў жыцці і максімальна самарэалізавацца. Нельга, каб педагог быў проста «ўрокадаўцам». Вельмі дрэнна, калі ён не разумее, не чуе вучня, не ідзе яму насустрач, не думае пра заўтрашні дзень, клапоціцца толькі пра веданне свайго прадмета, а ўсё іншае яго не хвалюе і не цікавіць.

Дапамагчы чалавеку стаць самім сабой няпроста, паверце, мы гэтаму таксама вучымся. Другая якасць ідэальнага настаўніка — жаданне вучыцца, таму што сапраўдны педагог застаецца вучнем на ўсё жыццё: ён вучыцца, у тым ліку і на сваіх памылках, вучыцца ў сваіх вучняў, спрабуе зразумець, чым яны незадаволеныя і што трэба змяніць.

Я лічу, што сёння ў школьнай праграме няма лішніх прадметаў. Дысцыпліны, якія вы вывучаеце на павышаным узроўні, — гэта ваш выбар, прадыктаваны далейшымі жыццёвымі планамі. Але ва ўсіх школьных прадметах ёсць тое, што дае агульнае развіццё. Ніхто сёння не ведае, якія прафесіі і веды будуць запатрабаваныя ў будучыні. Вы вызначыліся з галоўным стрыжнем — абралі пэўны профіль, але і іншыя школьныя прадметы з рахункаў не спісвайце...

Надзея НІКАЛАЕВА.
nikalaeva@zviazda.by

Ведай нашых!

СТУДЭНТЫ БДУІР ПАСПЯХОВА ЗДАЛІ «ТЭЛЕЗАЛІК»

Галоўны прыз фестывалю-конкурсу тэлевізійнай творчасці ў тэхнічных універсітэтах «Телезалік» заваявалі студэнты Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта інфарматыкі і радыёэлектронікі.

Фестываль прайшоў у Маскве ўжо трэці раз. Яго заснавальнікамі выступаюць Акадэмія медыяіндустрыі і Маскоўскі дзяржаўны тэхнічны ўніверсітэт імя Баўмана.

На конкурс было прадстаўлена больш як 50 фільмаў і тэлепраграм. Геаграфія ўніверсітэтаў, якія ўдзельнічалі ў фестывалі, вельмі шырокая: ад Далёкага Усходу і Іркуцка да Паўночнага Каўказа і Ульянаўска.

Праграма фестывалю аказалася даволі насычанай: лекцыі, майстар-класы, наведванне тэлеканала «Расія 24» і Астанкінскай тэлевежы, абмеркаванне работ. Для тых, хто не змог прыехаць у Маскву, былі арганізаваны анлайн-лекцыі і майстар-класы з удзелам вядучых педагогаў Акадэміі медыяіндустрыі і прафесіяналаў галіны.

Журы падвяло вынікі і ўручыла прызы ў намінацыях «Мой універсітэт», «Інжынер — прафесія творчая» і «Нашы выпускнікі ў гісторыі краіны». Фільм «БДУІР — 50 гадоў разам», створаны відэастудыяй прэс-службы і Маладзёжнага тэлебачання (МалТБ) універсітэта, атрымаў галоўную ўзнагароду фестывалю.

Пераможцы конкурсу атрымалі права на бясплатнае навучанне ў Акадэміі медыяіндустрыі па праграме павышэння кваліфікацыі. Лепшыя фільмы будуць рэкамендаваныя аргкамітэтам для эфіру на Грамадскім тэлебачанні Расіі.

Надзея НІКАЛАЕВА.
nikalaeva@zviazda.by

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Таму я ўпэўнены: неабходна змяняць падыходы да фарміравання вучэбнай праграмы на старшай ступені школы: вучню трэба даць магчымасць выбіраць з прапанаваных яму дысцыплін тыя, што спатрэбяцца для атрымання прафесіі і дапамогуць у дасягненні мэты. Але, напрыклад, такія прадметы, як літаратура і гісторыя, трэба вывучаць усім, незалежна ад выбару далейшага прафесійнага шляху. Літаратура — вельмі сур'ёзны інструмент для фарміравання асобы, таксама як і мова, і гісторыя. Нават адмоўнае стаўленне да той ці іншай падзеі адбываецца на фоне таго, ці ведаем мы пра гістарычную падзею. Таму гэтыя прадметы абавязкова павінны заставацца ў школьным раскладзе, бо інакш мы выйдзем са школы пустымі сасудамі.

Чалавечнасць і патрабавальнасць

— У кожнага дзіцяці меркаванне пра ідэальнага настаўніка пачынае складвацца з першага дня знаходжання ў школе. Адразу падаецца, што ідэальны настаўнік

А вось разважаць на тэму ідэальнага вучня мне больш складана. Якім ён павінен быць, напэўна, ведае ідэальны настаўнік? Я, канешне, магу прыводзіць шмат аргументаў на карысць таго, чаму нам трэба задаваць менш дамашніх заданняў і даваць больш свабоды, але ацэньваць вучня можа толькі настаўнік.

— Мы правялі сярод адзінаццацікласнікаў гімназіі анкетаванне. Увагі заслугоўвае тая акалічнасць, што пералічваючы характарыстыкі, уласцівыя ідэальнаму настаўніку, на першае месца ўсе ставілі найперш чалавечыя, а не прафесійныя якасці, — падкрэслівае Уладзімір Капцаў. — Галоўная думка — настаўніка трэба не баяцца, а паважаць. Ён павінен быць добрым, разумець сваіх вучняў і быць ім сябрам... Прапанавалі таксама паразважаць на тэму, а ці зможа замяніць настаўніка праз нейкі час робат ці суперкамп'ютар. У гэтым пытанні ўсе былі аднадушныя: педагог школе будучыні патрэбны. А вось будучыня папяровага падручніка ставіцца школьнікамі пад сумненне. У кнігі ж мастацкай на папяровых носьбітах больш шанцаў «выжыць».

За словам — справа

ЛЮБІШ ЧЫТАЦЬ — УМЕЙ І РАТАВАЦЬ,

ці Другое жыццё кнігі

Далёка не кожная кніга прыходзіць сюды ў добрым стане. Аднак выратаваць спрабуюць кожную.

Два гады таму на вуліцах сталіцы ўсталявалі зялёныя кантэйнеры для збору макулатуры. Здавалася б, што тут незвычайнага? Папяровыя адходы цэнтралізавана збіраюць ва ўсіх цывілізаваных краінах. Але з той прычыны, што ў ёмістасці трапляла шмат літаратуры, яе пачалі адкладваць і перадаваць у сацыяльныя ўстановы. Так нарадзіўся дабрачынны праект «Кнізе — другое жыццё». Дапамагаць у яго рэалізацыі вызваліся валанцёры — навучэнцы мінскіх ВНУ. Адна з іх — студэнтка IV курса Беларускага нацыянальнага тэхнічнага ўніверсітэта, будучы архітэктар Ксенія ПЛЫШЭЎСКАЯ, з якой мы пагутарылі пра цікаўнасць да папяровых кніг у XXI стагоддзі і задавальненне ад бескарыслівай дапамогі.

Галаўны цэнтр праекта знаходзіцца ў офісе кампаніі «Белгіпс-Эка». Гэта дастаткова вялікае памяшканне, якое больш нагадвае бібліятэку, — шэрагі паліц цалкам запоўнены самымі рознымі выданнямі, размеркаванымі па тэматыцы.

— Я аказалася тут чыста выпадкова, бо валанцёрствам ніколі не цікавілася, — расказвае Ксенія. — Іншая справа — кнігі: у сям'і ў мяне любяць чытаць, дома заўсёды была вялікая бібліятэка. Сюды прыйшла з сябрам, ён расказаў мне, што існуе такі праект, патрэбна дапамога ў разборцы выданняў. Адразу ж зразумела, што застануся тут надоўга — гэта сапраўдны рай для бібліяфіла.

«Кніжным» валанцёрствам дзяўчына займаецца прыкладна год. У імправізаваную бібліятэку яна ў сярэднім прыходзіць раз на тыдзень, хоць гатова праводзіць тут ці не кожны дзень, але вучоба дыктуе свае ўмовы. Валанцёры займаюцца адборам кніг з кантэйнераў, а таксама іх прыёмам у здатчыкаў, якія самі прыносяць непатрэбную літаратуру ў офіс кампаніі. Пасля гэтага трэба пачысціць выданні, высушыць, а потым рассартаваць па паліцах: беларуская літаратура, гістарычная і навуковая, руская і замежная класіка...

За адзін раз дзяўчына перабірае ў сярэднім сотню кніг, гэта займае некалькі гадзін. Але «запасаў» не ўтвараецца — перыядычна вялікія партыі перадаюць новым уладальнікам — сацыяльным установам з усёй краіны. За два гады ім было перададзена 25 тысяч выданняў. Дастаткова шмат кніг на замежных мовах, трапляліся і рарытэтныя. Самае старое — XVIII стагоддзя, яго перадалі ў Нацыянальную бібліятэку.

Размаўляем з Ксеніяй і пра электронныя кнігі. Па меркаванні дзяўчыны, «чыталкі» прынеслі шмат добрага і карыснага ў наша жыццё, акрамя таго, яны дазваляюць эканоміць шмат паперы, аднак сама яна наўрад ці змагла б адмовіцца ад папяровых выданняў. Ёй падабаецца дакранацца да старонак, адчуваць іх пах — гэтага не заменіць ніякая электроніка.

— Што мяне захапляе ў такім занятку? — перапытвае Ксенія. — Усё банальна: тут шмат кніг, кожны раз знаходзіш нешта новае і цікавае. Акрамя таго, ты ведаеш, што зробленая табой праца пойдзе на карысць іншым людзям — тым, у каго няма магчымасці набыць сабе літаратуру, бо мы перадаём яе ў дзіцячыя дамы, дамы састарэлых, бальніцы, школы, публічныя бібліятэкі. Гэта магчымасць падарыць радасць іншым, а значыць, і сабе самому.

Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.
lyskavets@zviazda.by

Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

Ксенія ПЛЫШЭЎСКАЯ і Павел ХЛЮСТ праводзяць у «бібліятэцы» амаль увесь вольны час.

За знешнім выглядам

Хто такія бодзібілдары

І ЧЫМ ЯНЫ ЦІКАВЯЦЦА АПРОЧ СВАІХ МЫШЦАЎ?

Апошнім часам у сацыяльных сетках часта можна сустрэць стэрэатып: усе мацакі — «недалёкія», а адзінае, на што здольныя, дык гэта прачытаць хоць бы састаў пратэіну. Мы зацікавілася: можа, так і ёсць? Хто яны — уладальнікі «стальных» мышцаў, ці, як іх яшчэ называюць, — бодзібілдары?
У Беларусі, трэба сказаць, бодзібілдынг не так развіты, як дзе-небудзь на Захадзе ці ў той жа Расіі, але сёння ўжо набірае абароты і ў нас, таму сустрэць яго прадстаўнікоў і прыхільнікаў — не дзіва. З адным з іх давялося паразмаўляць і мне. Кандыдат у майстры спорту па бодзібілдынгу Аляксандр ГВОЗДЗЬ расказаў пра цікавыя факты свайго жыцця.

— Чаму свой выбар ты спыніў менавіта на гэтым відзе спорту?

— У адзін момант падышоў да люстэрка і зразумеў, што я сабе не падабаюся. Як і кожнаму нармальнаму мужчыну, мне хацелася быць моцным, дужым, мець падцягнутае цела. Таму вырашыў штодзённа наведваць трэнажорную залу. Праз некаторы час гэта мяне зацягнула, і я стаў займацца на прафесіянальным узроўні, удзельнічаючы пры гэтым яшчэ і ў розных конкурсах.

— Якімі дасягненнямі можаш пахваліцца цяпер?

— На Кубку Беларусі заняў другое месца, пасля чаго і атрымаў званне кандыдата ў майстры спорту. Таксама з'яўляюся шматразовым прызёрам розных турніраў у нашай краіне.

— Часта можна пачуць, што мацакі цікавяцца толькі сваім знешнім выглядам. У цябе ёсць хобі?

— На мой погляд, гэта не зусім правільны стэрэатып. Шмат славутых людзей, у якіх, акрамя бодзібілдынга, ёсць нямала дасягненняў. Напрыклад, знакаміты культурыст Насэр Эль Сабанці. Ён мае вучоную ступень па гісторыі, сацыялогіі і паліталогіі. Сам жа я захапляюся музыкай — самастойна пішу тэксты і мелодыі. Раней дома была невялікая гуказапісная студыя, дзе і паявіліся на свет мае два альбомы ў стылі рэп. З імі выступаў у клубах, былі і сольныя канцэрты.

— Зараз, як я разумею, песні не запісваеш. Не было думкі аднавіць творчую дзейнасць?

— Можа, калі-небудзь працягну займацца музыкай. А пакуль няма свабоднага часу. Раніцай іду на работу, а ўвечары — на трэніроўку.

— Дзе і кім працуеш?

— У органах унутраных спраў. Я — кінолаг.

— Упэўнена, работа ў цябе важная і патрэбная. Падзяліся гісторыямі ці здарэннямі, якія найбольш запомніліся.

— Пра здарэнні расказваць не буду. У нашым жыцці і так хапае негатыву. Я лепей падзялюся прыемным момантам. Сабак, якія дасягнулі ўзросту васьмі гадоў, спісваюць са службы. Пад маім кантролем доўгі час знаходзіўся вельмі разумны сабака па мянушцы Бэст. Як правіла, сабак «пенсіённага» ўзросту ўсыпляюць. Бэст быў маім напарнікам, і я вырашыў забраць яго, каб выратаваць ад смерці. Цяпер зусім не шкадую аб гэтым. Проста люблю сабак, і ў той момант дома ў меня ўжо быў адзін хвастаты. Дык вось прывёў яму сябра. Цяпер жывём дружна.

— Дзякуй за гутарку! Ты даказаў мне, што бодзібілдары разумныя людзі. І больш таго — могуць быць творчымі і разнастайнымі асобамі.

На жаль, стэрэатыпы маюць над намі ўладу. І як прыемна, калі іх можна разбураць!

Дарыя ГАЛОЎЧЫЦ,
вучаніца 10 класа СШ №54 г. Мінска.

ФІТНЕС ЛЯ КАНАПЫ

У школьныя гады быў час, калі мы з аднакласніцамі захапляліся бодзіфлексам. Гэта дыхальная гімнастыка для пахудзення: сістэма абяцала неверагодныя вынікі і пры гэтым не патрабавала цяжкіх фізічных нагрузак. Мара, карацей. Кнігу па бодзіфлексе, якая знайшлася дома ў кагосьці з дзяўчат, перадавалі з рук у рукі. Я, калі дачакалася сваёй чаргі, нават перапісала некаторыя практыкаванні ў сшытак. Пахудзець з дапамогай гімнастыкі сапраўды ўдалося. Адзін мінус: падчас выканання практыкаванняў трэба было вельмі гучна дыхаць. Мама, калі чула мае старанні з суседняга пакоя, доўга не магла зразумець: ці гэта дачка фізкультурай займаецца, ці проста пыласос сапсаваўся.

Бодзіфлексам даўно ўжо не цікаўлюся, а вось звычка трэніравацца дома засталася. Ведаю, што вы хочаце спытаць: як прымусіць сябе ўстаць з канапы і пачаць мацаваць прэс? Тут табе ні эканамічнага стымулу ў выглядзе дарагога абанемента (гадавы ў трэнажорку цяпер каштуе 700-1000 рублёў), ні інструктара-наглядчыка. (Знаёмы трэнер, які нядаўна запусціў анлайн-праграму па пахудзенні, прызнаўся, што не чакаў такога наплыву ахвотных: людзям прасцей трымаць сябе ў форме, калі ёсць кантроль збоку.) Дамашні фітнес падкупляе тым, што не прывязвае да жорсткага графіка. Калі ёсць час, тады і займаешся. Але я раіла б скласці гэты графік самому і старацца яго прытрымлівацца: без дысцыпліны ўсё ж ніяк. Не можаце ўдзяліць запланаванаму фітнесу гадзіну — няхай гэта будзе паўгадзіны, але не прапускайце трэніроўку.

Што да фітнес-праграмы, то ідэальны яе варыянт — відэа на хвілін 45, дзе ёсць размінка, комплекс практыкаванняў з падрабязным тлумачэннем тэхнікі і расцяжка. Ці план заняткаў, разлічаны на 90 дзён (такія падборкі — іх знойдзеце на спецыялізаваных ютуб-каналах — якраз падыдуць навічкам). Плюс вялікіх відэа ў тым, што ў іх задаецца патрэбны тэмп і раўнамерна размяркоўваецца нагрузка на розныя групы мышцаў. Дзяўчаты часта ігнаруюць практыкаванні для рук і спіны (маўляў, я ж не хачу стаць мацаком), але, каб фігура выглядала гарманічна, яны таксама патрэбны.

Дамашні фітнес падкупляе тым, што не прывязвае да жорсткага графіка.

Стварыць бадзёры настрой дапаможа адпаведная музыка. Я, напрыклад, калі складаю новы плэй-ліст, з нецярплівасцю чакаю трэніроўкі, каб лішні раз паслухаць улюбёныя кампазіцыі. Вынікі даследавання навукоўцаў з універсітэта Брунэля (Лондан) сведчаць: калі мы займаемся пад музыку, узровень сілы павялічваецца на 13 працэнтаў. А вось рабіць практыкаванні і паралельна глядзець фільмы не раю: не той тэмп, а значыць, і расход калорый меншы.

Наконт спецыяльнага абсталявання. Трэніроўка без гантэляў таксама эфектыўная. У большасці выпадкаў дастаткова вашай уласнай вагі: сілавы фітнес з абцяжарваннем дыктуе, хутчэй за ўсё, мода. Калі ўсё ж такі будзеце купляць спартыўны інвентар, выберыце фітбол (вялікі гімнастычны мяч). Як па мне, з ім самыя вясёлыя трэніроўкі.

Хочацца паэксперыментаваць? Вазьміце звычайны ручнік. Гэта выдатны (і бясплатны!) спосаб узмацніць нагрузку і прапрацаваць мышцы, якія пры іншых абставінах не задзейнічаны. Увогуле, не лянуйцеся шукаць новыя варыянты практыкаванняў і раз на месяц мяняць праграму трэніровак. Так вы будзеце бачыць прагрэс і пазбегнеце эфекту плато (калі вага, нягледзячы на ўсе намаганні, стаіць на месцы).

Абавязкова ўключыце ў расклад кардыянагрузку (яна карысна для сэрца і неабходна, калі ваша мэта — пахудзець). Мае фаварыты — відэаўрокі па джайфе і хіп-хопе. Ніяк не магу сябе прымусіць бегаць больш за 15 хвілін, а вось танцаваць — колькі заўгодна.

І напрыканцы яшчэ колькі слоў пра матывацыю. Адзіны спосаб перамагчы ляноту — пачаць дзейнічаць. Угаварыце сябе на... пяціхвілінную трэніроўку. Усяго толькі. Праз пяць хвілін, упэўнена, вы ўцягнецеся і не захочаце кідаць пачатую справу.

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена
5 01 2017 г.

Камертон настрою

ЯК «ЗАЧАПІЦЬ» ПРАХОЖАГА,

ці Ад чаго залежныя вулічныя музыкі

Кожны з нас мноства разоў бачыў на вуліцах і ў пераходах маладых (і не вельмі) музыкантаў, выступленні якіх каму падаюцца рамантычнымі, каму найперш камерцыйнымі. Мы абышлі цэнтр сталіцы і распыталі некалькіх такіх творчых людзей: што прымушае іх даваць імправізаваныя канцэрты ў публічных месцах.

— Як даўно займаецеся музыкай?

Усевалад КАВАЛЕНКА: — З 54 пражытых гадоў іграю на гітары ўжо 42. Упершыню ўзяў у рукі інструмент у 1972 годзе. Памятаю, як мы з аднакласнікам на балконе ў Брэсце выконвалі «Ролінг Стоўнз».

Ксенія ЛІХАДЗЕДАВА: — Мне зараз 26, а пачала займацца музыкай яшчэ ў школе. Пасля скончыла фартэпіяннае аддзяленне музычнага каледжа ў Віцебску. Таксама ўмею іграць на гітары, як і на флейце, аргане, цымбалах і варгане (гэта былі дадатковыя інструменты). Але патрэбна пастаянная практыка, каб атрымлівалася сапраўды добра. Цяпер выступаю ў тандэме з Усеваладам, ён іграе на гітары, я — на сінтэзатары.

Аляксей АМЕЛЬКА: — Займаюся з 16 гадоў (хлопцу зараз 29). Асвойваў гітару самастойна: сядзеў, напачатку пад касету падбіраў акорды. Калі расказваю, што нідзе музыцы не вучыўся, некаторыя здзіўляюцца. А я лічу, што ўсё магчыма, і, калі сапраўды хочаш, — даб'ешся.

Раман СМЯШКОЎ: — Я пачынаў таксама падлеткам, на гітары іграю з 15 гадоў. Ужо ў 19—20 у Гомелі іграў у пераходзе і ў прыгарадных цягніках. Пасля быў доўгі перапынак, і вось толькі каля года назад, у 31, я зноў узяўся за інструмент.

— Што для вас вулічныя выступленні?

Усевалад КАВАЛЕНКА: — Для мяне гэта ў меншай ступені камерцыя. Шчыра кажучы, такім чынам асабліва і не заробіш. Вось, напрыклад, мой сябра Нікерсан працуе ў Францыі на адным месцы ўжо 15 гадоў. Яго ведаюць жыхары горада. Мала таго, людзі прыходзяць спецыяльна, каб паслухаць, як ён іграе. Сябра за гэтыя гады ўжо вельмі добра вывучыў кан'юнктуру, так што меней чым 120 еўра за вечар працы не атрымлівае. Для Нікерсона гэта чыстая камерцыя.

Аляксей АМЕЛЬКА: — Для мяне такія імправізаваныя канцэрты — накшталт рэпетыцый перад выступленнем на прафесійнай сцэне. Спадзяюся, што калі-небудзь для мяне яны стануць своеасаблівым пропускам на яе. На вуліцы трэба іграць на самай справе класна, каб чалавек спыніўся цябе паслухаць. Вельмі цяжка «зачапіць» прахожага.

Сапраўдны вулічны музыка адпрацоўвае праграму, а не проста так іграе, што прыйдзе ў галаву. Дарэчы, мы ніколі не просім грошай у слухачоў. Але калі нехта думае, што ўсё так проста, то памыляецца. Каб хоць нешта зарабіць, трэба каб людзям падабалася тое, што ты робіш. Гэта пастаянная праца над сабой, прычым вельмі цяжкая.Таму я іграю не кожны дзень. Пасля якаснага выступлення даводзіцца дзень-два адпачываць.

— Як звычайна рэагуюць слухачы?

Ксенія ЛІХАДЗЕДАВА: — Залежыць ад узроўню культуры. Вельмі непрыемна, калі падыходзяць нападпітку і просяць выканаць што-небудзь непрыстойнае. Тады проста рукі апускаюцца. Але, паколькі я граю на вуліцы ўжо не першы год, у мяне выпрацаваўся своеасаблівы імунітэт.

Усевалад КАВАЛЕНКА: — Многа раз сутыкнуўшыся з імі, ты ўжо звыкаешся, ведаеш, як трэба паводзіць сябе, каб пазбегнуць канфлікту. На шчасце, гэта толькі малая частка людзей. У асноўным або праходзяць міма, або слухаюць, усміхаюцца (часам і не). Аднойчы быў выпадак, калі падышоў мужчына і кажа: «Я вам даў грошай толькі за тое, каб вы тут не ігралі».

Ёсць і тыя, хто прымае нас на ўра. Гэта ў асноўным тыя выпадкі, калі чалавек чуе песню, якую некалі любіў і слухаў з задавальненнем. А мы менавіта вось такія, можна сказаць класічныя, кампазіцыі і выконваем. Прахожых чапляе на эмацыянальным узроўні.

Аляксей АМЕЛЬКА: — Чым больш людзей спыняецца цябе паслухаць, тым цікавей працуецца. Чым больш энергіі аддаеш ты, тым больш да цябе вяртаецца ад кожнага слухача. Энергетыка вельмі акрыляе. Калі ты раз гэта адчуў, з'яўляецца нешта накшталт залежнасці, пасля хочацца працаваць яшчэ і яшчэ лепш.

Нават калі спыняецца адзін чалавек і ты бачыш, што яму шчыра падабаецца, хочацца выкладвацца на мільён працэнтаў. І не важна, колькі грошай яны табе кінуць у капялюш. Было і такое, што падыходзяць людзі і пытаюць: «Ці можна пастаяць і паслухаць, але ў мяне няма грошай». Вядома можна! Мы ніколі і ні з каго грошы не «трасём». Калі ёсць жаданне і магчымасць пакінуць невялікую суму, будзем удзячнымі. Калі не, то хопіць і ўсмешкі.

— Чаго, на ваш погляд, не хапае вулічным музыкам?



Фота Алены САЛАВЕЙ.

Вулічныя музыкі пагадзіліся расказаць пра сябе.

Раман СМЯШКОЎ: — Дастаткова адвесці пару невялікіх пляцовак у месцах, аддаленых ад жылых дамоў, каб не перашкаджаць жыхарам. І каб пра іх ведалі мінчане. Гэта былі б такія своеасаблівыя свабодныя пляцоўкі: хто хоча, той іграе ці спявае. А людзі, калі ім падабаецца, слухаюць, адпачываюць. Музыканты маглі б купіць ліцэнзію на такі род заняткаў за невялікія грошы і свабодна працаваць.

Па каментарый мы звярнуліся да прэс-сакратара ГУУС Мінгарвыканкама Аляксандра ЛАСТОЎСКАГА:

— З пункту гледжання правапарадку ў гэтым занятку няма нічога супрацьзаконнага, за выключэннем таго, што знаходжанне на закрытых пляцоўках можа стварацъ пэўныя праблемы для прахожых (напрыклад, у пераходах), або калі музыканты дапускаюць абразлівыя прыставанні да людзей накшталт «дай грошыкаў, дай грошыкаў».

Перад міліцыяй стаіць першачарговая задача — ахоўваць грамадскі парадак і грамадзян. Напрыклад: ідзе маці з дзіцем па пераходзе, а там музыкант, так званы «вольны мастак» спявае непрыстойную песню. Ці спадабаецца вам такое? Што, малому вушы закрываць? І ці дапаможа гэта?

Галоўнае, да кожнай справы падыходзіць з розумам. Той жа вулічны музыкант павінен разумець, што можна рабіць, а чаго нельга, не выходзіць за маральна-этычныя рамкі, ведаць, што недапушчальна ў грамадстве. «Вольны мастак» свабодны не ад абавязацельстваў перад грамадствам, а ад заключэння адносін з якім бы тое ні было калектывам. Але на яго распаўсюджваюцца ўсе тыя ж патрабаванні — прытрымлівацца прававых і маральна-этычных нормаў, якія склаліся ў грамадстве.

Увогуле, улады падтрымліваюць гэтую ініцыятыву ў рамках развіцця культуры: некалькі разоў у год праводзяцца розныя фестывалі, у тым ліку і пад эгідай Мінгарвыканкама. А ў летні перыяд амаль кожныя выхадныя праходзяць розныя мерапрыемствы з прыцягненнем музыкаў.

Дар'я АРЭФ'ЕВА,
студэнтка VI курса
Інстытута журналістыкі БДУ.

Іголкай па скуры

МАМА, Я ХАЧУ ТАТУ́!

Чаму адны бясконца «набіваюць» іх, а другія — выдаляюць?

Татуіроўкі даўно перасталі асацыявацца толькі з афрыканскімі плямёнамі, турмой і арміяй. З аднолькавым поспехам можна заўважыць чарнільныя малюнкі пад скурай у школьніка, прадаўшчыцы ці офіснага супрацоўніка і ні кроплі гэтаму не здзівіцца. Таму сёння для таго, каб вылучыцца сярод іншых, невялікага малюнка, напрыклад, на руцэ ці назе ўжо недастаткова. Мы адшукалі маладых беларусаў, чые тату можна назваць незвычайнымі.

Сякеры на твары...

29-гадовы Дзмітрый Конанаў працуе тату-майстрам (маючы эканамічную адукацыю і адпрацаваўшы чатыры гады бухгалтарам). Ён з дзяцінства цікавіўся выяўленчым мастацтвам, а ўжо юнаком вырашыў нанесці малюнак на самога сабе — так у яго з'явілася першае тату.

— Сёння татуіроўкі пакрываюць прыкладна сорак працэнтаў майго цела. Кожная з іх мае пэўны сімвалізм для мяне, звязана з тымі ці іншымі падзеямі жыцця. Але гэта не такія канкрэтныя значэнні, як у «наколак» у крымінальным асяродку. Мастацкае тату хутчэй адлюстроўвае характар чалавека, яго інтарэсы, — тлумачыць хлопец. — Нягледзячы на тое, што ў мяне дваццаць татуіровак, любімую з іх назваць не магу — гэта ўсё роўна, што выбіраць любімую руку! — кажа Дзмітрый і смяецца.

Першае, што кідаецца ў вочы, калі глядзіш на Дзіму, — выява дзвюх маленькіх скрыжаваных сякер на ягоным твары, якая з'яўляецца спрошчаным варыянтам родавага герба. Такое незвычайнае месца для татуіроўкі малады чалавек выбраў не проста так: гэта своеасаблівы выклік сучаснаму грамадству ці нават своеасаблівая спроба выйсці з вузкіх рамак соцыуму, дзе ўсе павінны выглядаць аднолькава, і стаць часткай андэграўнду.

— Наперадзе мяне чакаюць новыя малюнкі. Я жыву гэтым. А калі стану старым, буду шкадаваць толькі аб адным — што на целе скончылася месца!

...і знак задыяка на патыліцы

Якаву Пятрову 24 гады, і яго цела пакрываюць сямнаццаць татуіровак (дарэчы, лічылі мы іх падчас сустрэчы, бо дагэтуль хлопец нават не задумваўся пра колькасць).

— Першую зрабіў восем гадоў таму і доўга хаваў ад бацькоў — баяўся, што будуць сварыцца. Калі маці яе ўсё ж заўважыла, сказала толькі адно: «Навошта хаваў?» Напэўна, маім бацькам не падабаецца, што на мне столькі малюнкаў, але яны ўжо прызвычаіліся і нічога больш не кажуць. Затое староннія людзі любяць разглядваць маё цела, асабліва летам. У такія моманты я пераўтвараюся ў «галерэю».

Скрыжаваныя сякеры — спрошчаны варыянт родавага герба.

Нейкага асаблівага памкнення ці штуршка, які натхніў бы Якава на першую татуіроўку, не было. Спадабаўся малюнак — ён перавёў яго на цела. Цяпер, бывае, пачынаецца ўсё з ідэі, з якой хлопец ідзе да майстра, і яны разам вырашаюць, як увасобіць яе ў рэальнасць. Увогуле, тату хлопца нельга назваць сімвалічнымі, паколькі яны не звязаныя ні з падзеямі, ні з людзьмі.

Якаў не прытрымліваецца адзінага стылю ў татуіроўках: яго правая рука цалкам пакрытая малюнкамі ў японскіх матывах, на грудзях — постапакаліптычная тэма.

— Вось гэты мілы слонік, — Якаў паказвае на тыльны бок далоні, дзе красуецца выява жывёлы, — з'явіўся выпадкова. Аднойчы мне давялося патрапіць у кампанію, дзе быў тату-майстар. Мы разгаварыліся, і ён нечакана прапанаваў: «Хочаш яшчэ што-небудзь табе «наб'ём»?» Я згадзіўся. Праз некалькі гадзін у мяне было на адну татуіроўку больш.

Аднак самае цікавае тату Якава знаходзіцца на бачным месцы і пры гэтым не заўважна — на патыліцы пад валасамі. Першапачаткова малады чалавек не планаваў рабіць яго там.

— Я знайшоў цікавы эскіз — выява майго знака задыяка ў форме круга — і прыйшоў з ім у салон. Разам з майстрам мы вырашылі, што ідэальнае месца для такой татуіроўкі — патыліца. Ніякіх адрозненняў у нанясенні малюнка на галаву, скажам, ад цела не было. Адчуванні тыя ж самыя, можа, нават не так балюча, — гаворыць хлопец.

Татуіроўкі для Якава — гэта філасофія жыцця, культура, пэўная эстэтыка. У яго сяброў, дзяўчыны таксама ёсць тату. Хлопец працуе барыстам у кавярні, і, на яго думку, яны дапамагаюць прыцягваць увагу наведвальнікаў. На пытанне пра будучыню Якаў адразу ж адказвае: «У мяне яшчэ дзве «чыстыя» нагі! Карацей, «набіваць» ёсць на чым. Тут галоўнае, каб фантазія не падвяла».

Надпіс пераўтварыўся ў пляму

Пакуль адны прыдумляюць эскізы для новых татуіровак, іншыя, наадварот, пазбаўляюцца іх. 22-гадовая Таццяна Лемяшэўская некалькі месяцаў хадзіла ў тату-салон на лазернае выдаленне малюнка. Працэдура гэтая не самая прыемная, каштуе даволі дорага, і для таго, каб поўнасцю прыбраць татуіроўку, спатрэбіліся не адзін-два сеансы.

— Зрабіла надпіс на руцэ тры гады таму. Спачатку мне ўсё падабалася, я разглядвала тату зблізу і не магла нарадавацца, бо майстар зрабіў усё так, як я хацела. Але праз некаторы час зразумела, што здалёк яна выглядае, як цёмная пляма. Да таго ж мне надакучыла тлумачыць усім, што азначаюць гэтыя літары з завітушкамі. А яшчэ, прыходзячы на пляж летам, я пачала звяртаць увагу, што татуіроўкі ёсць ледзь не ў кожнага другога, — расказвае Таццяна. — Ведаю, шмат людзей, якія таксама выдаляюць тату. Не бачу ў гэтым нічога незвычайнага, калі сучасныя тэхнічныя магчымасці дазваляюць гэта зрабіць.

Аднак дзяўчына не выключае, што ў будучыні зноў «наб'е» татуіроўку, толькі ўжо ў схаваным ад чужых вачэй месцы.

Ганна КУРАК,
студэнтка V курса
Інстытута журналістыкі БДУ.



Малюнкі на правай руцэ — гэта японскія матывы.

РАЗМЕРКАВАННЕ

На варце СанПіНаў

Тут галоўнае — прафілактыка

За работай практычна любой установы — дзіцячага садка, прадуктовай крамы ці аўтамайстэрні — стаіць цэлы шэраг працэдур, пра якія звычайнаму абывацелю вядома мала. У кожным раёне краіны існуюць спецыяльныя цэнтры, якія займаюцца кантролем вытворчага працэсу, аберагаючы насельніцтва ад небяспекі. У Чэрвеньскі раённы цэнтр гігіены і эпідэміялогіі прыехалі адразу два маладыя спецыялісты са сталіцы. Пра дэталі сваёй работы і першыя ўражанні ад новага месца яны расказалі карэспандэнтам «Чырвонкі. Чырвонай змены».

— Я родам з Віцебскай вобласці, з Глыбокага, — расказвае **ўрач-гігіеніст аддзела гігіены Наталля СВЯДЫШ.** — Пасля школы паступіла ў Беларускі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт на спецыяльнасць «Медыка-прафілактычная справа». Прызнаюся, вучыцца было цяжка, асабліва першыя тры курсы. Даводзілася вучыць СанПіНы (санітарныя правілы і нормы), гэта вельмі вялікія аб'ёмы інфармацыі. Але я старалася, ніколі не была на пераздачах.

На Чэрвеньшчыну дзяўчына трапіла яшчэ год таму — выйшла замуж, яе выбраннік якраз працуе галоўным інжынерам у адной з мясцовых гаспадарак па размеркаванні. Маладая сям'я жыве ў аграгарадку Заполле — гэта бліжэй да Мінска. Менавіта таму Наталля сама шукала для сябе першае месца працы ў раёне. Так супала, што ў мясцовым цэнтры гігіены і эпідэміялогіі была патрэба ў новых кадрах. Штодзень дзяўчына дабіраецца сюды на маршрутцы — выходзіць 4 рублі на дарогу туды-назад. Але кіраўніцтва абяцае ўнесці змяненні ў калектыўны дагавор, каб з'явілася магчымасць кампенсаваць выдаткі на транспарт.

«Галоўнае, што падабаецца, — магчымасць нармальна прагуляцца ў цішыні і спакоі».

— У абавязкі ўрача-гігіеніста ўваходзіць кантроль санітарнага стану ў раёне, — уводзіць у курс справы Наталля. — Уся работа дзеліцца на чатыры кірункі: камунальная гігіена, гігіена працы, гігіена дзяцей і падлеткаў і гігіена харчавання. Я займаюся першымі трыма. Ёсць спецыяльны каардынацыйны план, у якім распісаны праверкі самых розных устаноў раёна на цэлы год. Усе яны падраздзяляюцца на групы: высокай рызыкі (звычайна ўсё, што звязана з харчаваннем і дзецьмі), гэта правяраюць раз на год, а таксама сярэдняй і нізкай, там праверкі радзейшыя. У адпаведнасці з планам я прызначаю канкрэтную дату і раблю выезд. Першы раз, напрыклад, ездзіла на прадпрыемства па вытворчасці вырабаў з пластыку ў Смілавічах. На месцы правяраем, каб усё адпавядала санітарным нормам і правілам: умовы працы, тэрыторыя, памяшканні. У дзіцячых садках можам правяраць харчаблокі, адпраўляем пробы на аналіз у нашу лабараторыю. Глядзім нават на аздабленне будынкаў: чым яны пафарбаваны, чым аклеены сцены, як праводзіцца ўборка... У жніўні ўдзельнічала ў прыёмцы школ да навучальнага года.

Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

Злева направа: **Алена Лагавая, Наталля Свядыш і Кацярына Ефімкова ў лабараторыі Чэрвеньскага цэнтра гігіены і і эпідэміялогіі.**

Разам з Наталляй у цэнтр на пасаду ўрача-эпідэміёлага прыехала **мінчанка Алена ЛАГАВАЯ.** Дзяўчаты вучыліся на адным курсе, але ў розных групах. Пасля завяршэння вучобы ў сталіцы не было вакансій, таму інтэрна накіравалі ў Чэрвень. На месцы маладому спецыялісту далі пакой у інтэрнаце, цяпер яна наводзіць у ім прыгажосць.

— Гэта ні ў якім разе не нейкія амбіцыі ці ганарлівасць, але я ўсё ж-такі прывыкла да вялікага горада, таму ў Чэрвені мне пакуль цяжкавата, — прызнаецца Алена. — Галоўнае, што падабаецца, — магчымасць нармальна прагуляцца ў цішыні і спакоі. Можна сканцэнтравацца на іншым, я, напрыклад, пачала шмат чытаць.

Работа эпідэміёлага мае шмат агульнага з работай гігіеніста, але і адрозненняў хапае. Галоўны фронт работы — інфекцыі і эпідэміі, таксама яна сочыць за санітарным рэжымам у бальніцах. Калі чалавека ўкусіла дзікая жывёла і ёсць падазрэнне на шаленства, сітуацыю кантралюе эпідэміёлаг. Алена, як і Наталля, таксама нярэдка бывае на выездах, але правярае іншыя аспекты: рэжым дэзынфекцыі, рэгулярнасць медагляду супрацоўнікаў, выкананне тэмпературнага рэжыму захоўвання прадуктаў. Галоўная задача эпідэміёлага — папярэдзіць узнікненне масавых заражэнняў

— Вядома, урач-гігіеніст ці ўрач-эпідэміёлаг — гэта не тое самае, што лечачы доктар, — пагаджаецца Алена. — Звычайна мы не прымаем пацыентаў, не ставім дыягназы. Але закрываем не менш важны «фронт» — прафілактычны. Калі б гігіеністы не кантралявалі выкананне ўмоў працы, то колькасць прафесійных захворванняў магла б рэзка ўзрасці.

Яшчэ адзін малады спецыяліст цэнтра — **урач-лабарант санітарна-гігіенічнай лабараторыі Кацярына ЕФІМКОВА.** Дзяўчына вучылася ў Гомельскім дзяржаўным медыцынскім універсітэце, на медыка-дыягнастычным факультэце. Як і Алене, ёй далі пакой у мясцовым інтэрнаце.

— Скажу абсалютна шчыра: за два гады я палюбіла Чэрвень, — усміхаецца Кацярына. — Мне падабаецца спакой, тут вельмі добразычлівыя жыхары. Адзінае, што на выхадныя я звычайна езджу ў Гомель ці Мінск, там больш магчымасцяў для адпачынку. Урач-лабарант у цэнтры займаецца аналізам харчовых прадуктаў і вады. Даследуюцца таксама фізічныя фактары: асветленасць, мікраклімат. Ёсць у нас і пост радыяцыйнага кантролю, дзе можна правяраць прадукты на ўтрыманне цэзію і іншых радыеактыўных ізатопаў.

Размаўляем з дзяўчатамі пра заробак. Аклад інтэрна — 290 рублёў, астатняе залежыць ад аб'ёму зробленай работы. У сярэднім спецыялісты, якія ўжо прайшлі інтэрнатуру, атрымліваюць 500—550 рублёў.

— Галоўнае, што нам падабаецца, — гэта рэжым работы і калектыў, — сыходзяцца ў думцы Наталля і Алена. — Адзіны мінус — шмат папяровай работы, хоць гэта не зусім наш профіль, бо мы павінны ўвесь час быць «у полі». Прафесія ў нас унікальная, такіх спецыялістаў, акрамя аднаго патоку ў БДМУ, ніхто ў Беларусі не рыхтуе. Першачаргавая задача цяпер — удасканальвацца ў сваёй працы, магчымасць для гэтага ў нас ёсць.

Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.
lyskavets@zviazda.by
Мінск — Чэрвень — Мінск.

МІЛЬЁН ПУНСОВЫХ РУЖ...

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)

Сам комплекс пабудаваны тры гады таму па галандскай тэхналогіі. Спецыялісты з гэтай вядомай сваімі кветкамі краіны перыядычна прыязджаюць сюды, каб праверыць работу беларускіх калег і пракансультаваць іх (дарэчы, супрацоўнікі агракамбіната таксама нярэдка ездзяць у «краіну цюльпанаў», каб пераняць досвед тамтэйшых кветкаводаў). Адтуль жа прывезены і саджанцы. У цяпліцы ўвесь час падтрымліваецца вільготнасць каля 80 працэнтаў. Для гэтага пад столлю развешаны спецыяльныя пульверызатары, якія аўтаматычна замяраюць узровень вільгаці ў паветры і, калі трэба, распыляюць аэразоль.

Тэмпература ў памяшканні ўдзень не апускаецца ніжэй за 20 градусаў. Акрамя гэтага, над кустамі шчыльна размешчаны лямпы, якія даюць раслінам патрэбнае святло. Усяго за суткі ружы павінны асвятляцца 20 гадзін, таму зімой гэта абсталяванне працуе напоўніцу нават у светлы час. Але залішняга цяпла ружа таксама не любіць — улетку нярэдка даводзіцца прымяняць зашторванне, каб аберагчы расліну ад спёкі. Для таго, каб паветра не застойвалася ў адным месцы, працуюць спецыяльныя сістэмы вентыляцыі.

Увогуле, пераважную частку работы на комплексе выконвае аўтаматыка. Тым не менш у брыгадзе №5 працуе 18 кветкаводаў. Іх задача — непасрэдная нарыхтоўка кветак і догляд за асобнымі кустамі. За кожнай супрацоўніцай замацавана 1200 квадратных метраў — участак, за які яна нясе адказнасць і дзе праводзіць свой працоўны дзень. Сярод кветкаводаў шмат жыхарак Багатырова і навакольных пасёлкаў, адна з іх — Дар'я ЛІПЕНЬ. Дзяўчына скончыла Беларускі дзяржаўны аграрны тэхнічны ўніверсітэт, дзе вучылася на інжынера-тэхнолага. На камбінат прыйшла працаваць з простай прычыны — блізка ад дому. Спецыяльная адукацыя тут не патрабавалася — усіх кветкаводаў-навічкоў замацоўваюць за дасведчанымі калегамі, а вучоба адбываецца на месцы.

Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

Рукі Дар'і Ліпень за некалькі гадоў ужо прызвычаіліся да «калючай» працы.

— Стараннім людзям здаецца, што зрэзка ружы — просты тэхнічны працэс, — расказвае Дар'я. — Па-першае, гэта трэба рабіць своечасова — з аднаго боку, нельга спяшацца, бо расліну можна пашкодзіць, з іншага, калі спазніцца, то не атрымаеш добры тавар. Па другое, зразаць таксама трэба ўмець — гэта робіцца на дакладнай даўжыні сцябла. Трэба выдаляць пасынкі, халастыя парасткі, рабіць шмат іншых працэдур догляду. Таму ўсё не так проста.

Куст ружы высаджваецца на пяць гадоў, увесь гэты час ён дае новыя і новыя кветкі. Гэта накладвае свой адбітак — у кветкаводаў сезон ніколі не завяршаецца. Камбінату ў Багатырове ўсяго тры гады, таму тутэйшыя расліны ў самай сярэдзіне свайго жыццёвага цыкла.

— Асабліва важны для нас час — святы, — кажа Дзіяна Грышкіна. — Да іх мы рыхтуемся загадзя. Каб вырасціць ружу да Дня святога Валянціна, нарошчваць масу кветак пачынаем ужо ў снежні, а ў студзені робім догляд па закладцы так званай «хвалі». Тры галоўныя даты для нашых кветкаводаў — 14 лютага, 8 Сакавіка і 1 верасня. Ці адрозніваецца наша ружа ад галандскай? Яна абсалютна аналагічная. Можа быць, у людзей ужо склалася пэўнае ўяўленне (тым больш, з-за мяжы звычайна прыязджаюць спецыяльна адабраныя кветкі), але ніякай розніцы паміж імі няма. Усяго за год мы зразаем каля 2,5 мільёна кветак — у маштабах краіны гэта нямала.

Пасля зрэзкі ўся прадукцыя паступае ў халадзільную камеру, дзе пэўны час захоўваецца пры тэмпературы, блізкай да нуля градусаў — гэта робіцца, каб ружы добра стаялі. Потым яны паступаюць у сартавальную машыну. Камп'ютар раздзяляе прадукцыю паводле памеру бутона і ў залежнасці ад гэтага паказчыка ўкарочвае сцябло. Гэта гарантуе, што самая доўгая і дарагая кветка сапраўды будзе прыгажуняй. Адсюль яна ідзе на продаж.

— Шчыра скажу, мяне ўжо ружай не здзівіш, нават самай прыгожай, — смяецца Дар'я Ліпень. — Столькі я іх бачыла за гэты час! Таму любая іншая кветка, але не яна. Працаваць мне падабаецца, гэта не манатонная праца — штодзень новыя задачы і праблемы. Заробак таксама нядрэнны, каля сярэдняга па сталіцы. Трэба толькі прывыкнуць да тутэйшага клімату, а таксама да пастаяннага болю ад уколаў шыпоў — ад гэтага ніводная спецвопратка не ўратуе.

Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.
lyskavets@zviazda.by

ЯНЫ ПРОСТА ДАРАЦЬ ЦУДЫ!

СУМЕСНЫ ПРАЕКТ
СКАРБОНКА ДОБРЫХ СПРАЎ
БРСМ
ЧЫРВОНКА

Яўгенія Бармоціна вось ужо дзесяць гадоў з'яўляецца сакратаром пярвічнай арганізацыі БРСМ філіяла «Магілёўскія цеплавыя сеткі» РУП «Магілёўэнерга». Як яна сама прызнаецца, за гэты час самай чуллівай і любімай акцыяй для яе сталі «Цуды на Каляды».

Упершыню Яўгенія арганізавала збор падарункаў для Магілёўскага дома дзіцяці яшчэ ў 2006 годзе, годам пазней да яго далучыўся і Бабруйскі дом дзіцяці. Стала ўжо добрай традыцыяй не толькі збіраць падарункі, але і наведваць дзяцей, праводзіць навагоднія паказы з удзелам Дзеда Мароза і Снягуркі (ролю якой выконвае Яўгенія). Адначасова наша гераіня з'яўляецца і камандзірам валанцёрскага атрада «Дапамога!» Сваю каманду набірала з самых нераўнадушных і адказных работнікаў прадпрыемства. Валанцёрскі атрад на чале з Яўгеніяй — жаданыя госці ў любой дзіцячай сацыяльнай установе. Дарэчы, камандзір прыцягвае да добрых спраў і сваіх дзяцей: першакласнікі выконваюць ролі мішак-таптыжак у матуліных прадстаўленнях і з дзяцінства вучацца міласэрнасці ў адносінах да іншых людзей.

Валанцёрскі атрад пад кіраўніцтвам Яўгеніі Бармоцінай круглы год аказвае дапамогу дзецям-інвалідам, сіротам і дзецям, якія аказаліся ў цяжкай жыццёвай сітуацыі, яго ўдзельнікі наведваюць таксама пажылых людзей, ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны ў рамках акцый «Шчасце ў падарунак», «Велікодны падарунак», «Дзень аховы дзяцей з БРСМ», «Мы выбіраем дапамогу пажылым людзям», «Нашы дзеці» і іншых. Дэвіз атрада — «Спяшайцеся рабіць добрыя справы!». Бо, як дадае Яўгенія, тое, што аддаў, — ніколі не згубіш!

Сяргей РАСОЛЬКА.
rs@zviazda.by

Друкуецца ў «Маладосці»

Настасся НАРЭЙКА працуе журналістам і таму, магчыма, здольная ў сваіх тэкстах паспяхова спалучаць вастрыню тэмы з якасным валоданнем моваю. Яе апавяданне, прапанаванае чытачам «Чырвонкі. Чырвонай змены», — гэта вопыт назіранняў за жыццём. Убачанае Настасся перажывае разам са сваімі героямі. Магчыма, менавіта такая эмацыянальная далучанасць і вызначае аўтарскую манеру.

Настасся НАРЭЙКА

ПРОСТА ПАДАЕ СНЕГ

На лесвіцы было зімна.

Яна стаяла нерухома, нібы не адчувала босымі нагамі холаду, не заўважала, што вязаная хустка адным канцом дакранаецца да падлогі. Унізе цяжка грукаталі крокі ды з металічным звонам саскокваў з прыступкі на прыступку чамадан на колцах.

Пікнулі дамафонныя дзверы — і ўсе гукі зніклі. Аглушаная цішай, яна нібыта ажыла, пабегла ўніз да акна. «Нашто? Нашто ты робіш гэта?» Яна бачыла, як ён аддаляецца, і снег (адкуль толькі ўзяўся?) хавае сляды ды яшчэ дзве паралельныя лініі за колцамі чамадана.

Хустка саслізнула на падлогу. Яна прысела лёгка, як балерына, падняла пульхны белы ком і павольна пайшла наверх. Зачыніла дзверы кватэры. Паклала ключы на паліцу пад люстэркам і толькі тады адчула слабасць у нагах. Трэба было нешта рабіць з ёю...

Навобмацак у цемры яна знайшла крэсла, села, шчоўкнула ўключальнікам лямпы. Святло закавала яе ў кола, нібыта ратуючы ад усяго злога. Падабраць пад сябе ногі, рукі схаваць у хустцы. А сэрца? Куды падзець сэрца?!

Тэлефон маўчаў. Яна баялася яго з той пары, калі пасля любімай мелодыі незнаёмы жаночы голас сказаў, што ў яе няма больш каханага мужа.

— Як вы можаце гэта вырашаць? — спытала яна. — Толькі ад мяне залежыць, каханы ён ці не.

Суразмоўніца збянтэжылася, а калі загаварыла, голас яе быў ужо не такі ўпэўнены. Жанчына зусім маладая, амаль дзяўчынка — яна зразумела гэта і адчула... Сполах? Не. Агіду? Не. Крыўду? Не. Гэта не мела назвы.

У пакоі цёпла, але, нягледзячы на гэта, па спіне яе войскам ішлі дрыжыкі. Цяжка быць полем бою. Асабліва, калі вайна ідзе яшчэ і ўнутры. Вайна ў вайне.

Яна абняла калені рукамі і з усіх сіл заплюшчыла вочы. Гэта дапамагала вярнуць адчуванне яго абдымкаў, яна рабіла так кожны раз, калі мужа не было побач. «Нашто? Нашто гэта цяпер?»

Адпушчанай спружынай яна ўскочыла з крэсла, скінула хустку... «Спяшайся!» У прыхожай абула боты на голыя ногі, апранула паліто паверх хатняй сукенкі ў клетку, усцягнула шапку на непаслухмяныя кучаравыя валасы. «Спяшайся!»

Сумка здалася занадта лёгкай. Такая не ўтрымае на гэтай Зямлі! Кінула ў яе мабільнік, пальчаткі, шчотку для адзення, пульхную касметычку, тэлефонны даведнік, статуэтку кошкі (навошта?). «Спяшайся!»

Дзверы. Ключы. Выдых. Лесвіца. Яна забылася пра ліфт, як з паўгадзіны таму забыўся муж. Сыходзіць трэба хутка. Яна не ўспамінала пра гэта.

Дамафон пікнуў нешта суцяшальнае. Яна расчыніла дзверы і выйшла проста ў снег. Белыя зорачкі заляпілі ёй вочы, набраліся ў боты, упляліся ў валасы. Яна чхнула і засмяялася — лёгка, зусім не істэрычна. «Тысячы белых ежат». Пашукаўшы на паліцах памяці, яна знайшла аўтара гэтага параўнання — Эдуард Асадаў. Сляпы паэт. У галаве ўспыхнуў вобраз — малады прыгожы твар, на якім свой знак у выглядзе чорнай павязкі на вачах яшчэ не паспела пакінуць вайна. «А что если просто падает снег и тормоза не визжат? А что если просто идет человек и губы его дрожат?» Бязгучна яна шапатала па памяці гэтыя словы, і слёзы сыпаліся з вачэй. Так выходзіць боль. Ад смеху да плачу — адзін крок...

Яна плакала доўга — напэўна, цэлую вечнасць. Прахожыя нешта гаварылі ёй, разумелі сваё бяссілле і знікалі.

«Спяшайся!»

Яна ўздрыгнула, страсянуўшы з сябе цэлую завіруху, і пабегла. Цераз снег. Цераз боль. Цераз бель.

«Спяшайся!»

Ногі неслі самі, яна давярала ім слепа. Вуліцы змянялі адна адну. Немагчыма было заўважыць іх, не тое, што запомніць назвы. «Рабінавая». Перад гэтым словам яна застыла, прыціснуўшы сумку да грудзей. Нешта знаёмае... Прынамсі, цяпер не лепшы час думаць пра гэта.

«Спяшайся!»

Упэўненым крокам яна пайшла да дома пад нумарам 5. Першы пад'езд... Каля яго села на заснежаную лаўку, абхапіла сумку яшчэ мацней і ўпершыню за ўвесь свой марафон задумалася. «Нашто? Нашто ты робіш гэта?» Адказ быў недзе блізка.

Дрыжачымі ад холаду і сполаху рукамі яна пачала расшпільваць сумку — ніяк. Трэба зняць пальчатку. Калі тысяча калючых сняжынак упіліся ў руку, яна адчула сябе дзяўчынкай з запалкамі з казкі, больш падобнай на праўду. Нарэшце! Дзе ж?

Яна шукала і не ведала, што шукае. Яшчэ адны пальчаткі.. Шчотка... Тэлефон... Не тое! Ёй няма каму больш званіць. Сыну раскажа пасля — у яго важныя спаборніцтвы ў іншым горадзе.

А гэта што?

Яна выцягнула на свет божы тэлефонны даведнік. «Нашто?» Здагадка, а дакладней — успамін, прашыў наскрозь, як электрычны ток. Тацянічава! Літара Т. Імгненна адшукала яе, а потым — прозвішча. «Тацянічава Ірына Ігараўна...» Вось тут. Нумар тэлефона, адрас... Рабінавая, 5! Яе сэрца глуха ўпала і пакацілася. Балюча. Цяжка. Горка. Гэта накаўт.

«Нашто я прыйшла сюды?»

— Ты ведаеш, — адказала нешта ўнутры.

Яна пазнала голас нянавісці і спужалася, толькі не паказала гэтага. З вар'ятамі нельга спрачацца.

— Ідзі.

Ані руху.

— Ідзі! Скажы ёй усё, што думаеш!

Ані гуку.

Нянавісць бяссільна тарганулася ўнутры, на што болем адгукнулася сэрца.

— Ідзі!

Тэлефонны даведнік выпаў проста ў снег. І ў той жа момант пачуўся ціхі жаласлівы плач. Яна апусцілася з лаўкі на калені. У халодную без пальчаткі руку тыцнулася носам кацяня, такое белае, што яго цяжка было разгледзець сярод снегу.

— Маленькае маё.

Яна асцярожна прыціснула кацяня да грудзей. Снег уперамешку са слязамі сыпаўся на яго пушыстую поўсць.

— Ты пойдзеш са мной.

Гэта было сцвярджэнне, а не пытанне.

— Мы цяпер разам.

Кацяня ўзняло пыску і паглядзела ёй проста ў вочы. Так асэнсавана і ўдзячна, што ў яе заплакала сэрца.

Калі гучна ляпнулі дзверы пад'езда, у якім жыла саперніца, яна сама здзівілася хуткасці сваёй рэакцыі. Імгненне — і дрэва надзейна схавала дзве адзінокія істоты, што знайшлі адна адну.

На вуліцу без верхняга адзення і ў тапках выбег яе муж. Былы? Напэўна, цяпер трэба так называць яго... Гэта думка, на дзіва, не выклікала болю.

Мужчына, між тым, схіліўся каля лаўкі, нешта шукаючы. На чорных валасах пераліваліся і не раставалі сняжынкі, як тады, калі яны падчас першага спаткання забыліся пра час і гулялі пад снегам усю ноч. У адно імгненне яна ўспомніла ўсё: усмешкі, словы, дотыкі, шчасце — і зацiснула рот вольнай рукой, каб заглушыць рыданне.

— Сняжок! Дзе ты, Сняжок?

Цішыня. І завея.

— Сняжок...

«Ён цябе шукае».

Яна дакранулася вуснамі да цёплай поўсці кацяняці і ад усёй душы марыла ў той момант быць ім. Каб шукаў... Каб непакоіўся...

— Сняжок! Як толькі яна магла выкінуць цябе?! Эх, Ірка, Ірка!

Пошукі не мелі сэнсу. Ён хацеў было вяртацца ў пад'езд, як раптам заўважыў у гурбе нешта фіялетавае. Змёў даланёй снег і падняў тэлефонны даведнік.

— Дзіўна.

Ён адгарнуў апошнія старонкі, дзе запісвалі нумары ад рукі, пазнаў жончын почырк і цяжка апусціўся на лаўку.

— Ліля.

Яна пачула сваё імя і заплюшчыла вочы. Гэта было суцяшальна да болю. Як напамін пра ампутаваную руку.

Муж сядзеў ціха. Яна лёгка чытала па яго спіне цяжкія, здаўленыя рыданні. Невыносна цягнула падысці, пакласці руку на плячо, але нельга... Больш нельга...

Кацяня прыснула, і яна баялася паварушыцца. Хай хоць нехта будзе гэтай ноччу шчаслівы!

Другі раз бразнулі дзверы. Маладая жанчына, зусім дзяўчынка, у адным ярка-ружовым халаціку з выклікам адкінула з вачэй светлыя валасы.

— Алег! Здаўся табе гэты кот! Пайшлі.

Ён здрыгануўся, нібы толькі што заўважыў яе, паглядзеў у лялечныя вочы нябеснага колеру і падняўся.

Толькі калі ён адышоў крокаў на дзесяць, Іра крыкнула:

— Ты куды?

— Дадому.

Маладая жанчына так і застыла з адкрытым ротам. Потым зноў бразнулі дзверы.

Кацяня ціха мяўкнула, калі яе рука машынальна сціснулася.

— О, прабач.

Мужавы сляды ўжо паспеў замесці снег, і яна ўсумнілася нават: а, можа, гэта ўсё было трызненнем?

Нечакана стала невыносна холадна. Яна выйшла з-за дрэва якраз у той момант, калі дзверы пад'езда адчыніліся чарговы раз. І з іх адна за адной вылецелі мужавы рэчы. Чамадан усё яшчэ распранутая Іра вывезла на ганак і злосна адпіхнула нагой. Жонку Алега яна заўважыла не адразу.

— Якая сустрэча! Бачу, ты і ката падабрала. Няхай. Цяпер абодва галадранцы твае.

І яшчэ раз дзверы — як выбух.

Адной рукой яна сабрала рэчы ў чамадан і асцярожна павезла яго за сабой. Колцы танулі ў снезе, але яна не заўважала цяжару. Дарога назад адабрала нашмат больш часу.

Алег сядзеў на лаўцы каля іх пад'езда і ў задуменні гартаў тэлефонны даведнік. Яна нахілілася і асцярожна пусціла на снег кацяня, якое вагалася некалькі імгненняў, а потым пабегла да мужа.

— Сняжок!

Голас Алега зазвінеў шчасцем. Ён паклаў даведнік на лаўку і ўзяў кацяня на рукі — малы, пульхны камячок.

— Мы цяпер бяздомныя з табою...

Яе сэрца сціснуў боль.

Тонкая рука апусцілася на яго плячо.

— Хіба я адбірала ў цябе ключы?..

Центр Промышленной Оценки

• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

Извещение о проведении повторного аукциона

Организатор аукциона	ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа 5/2, пом. 1703
Продавец	ОАО «Минскпроектмебель», г. Минск, ул. Кальварийская, 33

Предмет аукциона

Наименование	Назначение	Общая площадь	Инвентарный номер Адрес
ТП-224	Здание специализированное энергетики	60,4 кв.м	500/С-53671 г. Минск, ул. Веры Хоружей, д. 25, корп. 2

Сведения о земельном участке: Предмет аукциона расположен на земельном участке с кадастровым номером 500000000008005388, общей площадью 2,7060 га, который предоставлен Продавцу на праве аренды для эксплуатации и обслуживания производственных зданий и сооружений по ул. Веры Хоружей, 25. Срок действия – до 31.01.2050.
Охранная зона газопровода, площадь 0,1520 га; охранная зона линий электропередачи, площадь 0,0040 га; охранная зона линий электропередачи, площадь 0,0050 га

В состав Предмета аукциона входит следующее имущество:
- Оборудование с инвентарным номером по бухгалтерскому учету 00007: кабельные сети
- ТМГ 630/10У1 630/10, щит высокой стороны НСО-3, щит низкой стороны ПЩО, конденсаторная установка LC-z-4-4-IP20

Начальная цена с НДС 20%: **86 535,65 белорусского рубля (BYN)**

Задаток 10% от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях (BYN) перечисляется на р/с № 3012343260010 в Дирекции «ОАО Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК 153001739, УНП 191021390, получатель платежа ЗАО «Центр промышленной оценки»

Срок подписания договора купли-продажи: **10** рабочих дней после осуществления продавцом регистрационных действий в отношении соответствующего земельного участка, необходимого для обслуживания капитального строения, которое является предметом аукциона, в установленном законодательством порядке

Дополнительная информация

В случае признания земельного участка с кадастровым номером 500000000008005388 неделимым, Доверитель обязуется указать в договоре купли-продажи предмета аукциона сведения о том, что земельный участок является неделимым, указать в договоре купли-продажи ссылку на документ компетентного органа, подтверждающий неделимость земельного участка, а также приобщить документ, подтверждающий неделимость земельного участка, к материалам регистрационного дела

Условия оплаты предмета аукциона

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5%) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты за предмет аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 22.11.2016

Дата и время проведения аукциона	**20.01.2017** в 14 ч. 00 мин по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»**
Дата и время окончания приема документов	**19.01.2017** до 17.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»**
Контактные телефоны:	Тел: +375 17-280-36-37; +375 29-317-95-42. Email: auction@cpo.by

Центр Промышленной Оценки

• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

Извещение о проведении повторного аукциона

Организатор аукциона	ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703
Продавец	ООО «БЕЛИНВЕСТ-инжиниринг», г. Минск, пл. Свободы, 17/2

Предмет аукциона

Лот №1

Административное помещение	Административное помещение	390,1 кв.м	500/D-708176123	г. Минск, пр-т Победителей, 119-505
Начальная цена с НДС 20%		**709 078,86 белорусского рубля (BYN)**		

Лот №2

Административное помещение	Административное помещение	333,7 кв.м	500/D-708175052	г. Минск, пр-т Победителей, 119-506
Начальная цена с НДС 20%:		**571 528,22 белорусского рубля (BYN)**		

Лот №3

Административное помещение	Административное помещение	345,2 кв.м	500/D-708175055	г. Минск, пр-т Победителей, 119-510
Начальная цена с НДС 20%		**586 456,20 белорусского рубля (BYN)**		

Лот №4

Административное помещение	Административное помещение	25,4 кв.м	500/D-708176124	г. Минск, пр-т Победителей, 119-514
Начальная цена с НДС 20%		**48 174,71 белорусского рубля (BYN)**		

Задаток 10% от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях (BYN) перечисляется на р/с № 3012343260010; нерезидентами РБ задаток может перечисляться в валютном эквиваленте по курсу Нацбанка РБ на дату платежа на в/с: в долларах США (USD) – 3012743260072; в евро (EUR) – 3012343265060; в российских рублях (RUB) – 3012743260098; в Дирекции «ОАО Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК 153001739, УНП 191021390, получатель платежа — ЗАО «Центр промышленной оценки».

Срок подписания договора купли-продажи: **10** рабочих дней после проведения аукциона

Условия оплаты предмета аукциона

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5%) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и порядке оплаты за предмет аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона, оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 01.11.2016

Дата и время проведения аукциона	**25.01.2017** в 14 ч. 30 мин. по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»**
Дата и время окончания приема документов	**23.01.2017** до 17.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»**
Контактные телефоны	+375 17-280-36-37; +375 29-317-95-42. Email: auction@cpo.by

МНЕ СНЯЦЦА НАРАЧ І «ЗУБРАНЯ»...

На ўсё свой час. У думках застаецца толькі тое, што было сапраўдным, вартым памяці. З Нараччу, з «Зубранём» у мяне было сем сустрэч. Першы раз, калі я была яшчэ ў другім класе, апошні — падчас восеньскай змены «Прэс-перспектыва», на якую былі запрошаны вучні 8—11 класаў, пераможцы адборачнага этапу XII рэспубліканскага фестывалю-конкурсу дзіцячых сродкаў масавай інфармацыі «Свежы вецер».

Кожная з маіх сямі нарачанскіх змен — гэта як асобнае «маленькае жыццё». Дзівоснае, напоўненае імгненнямі натхнення, няўрымслівай дзейнасці, бясконцага руху. «Зубраня» заўсёды можа сабраць у адным месцы і ў адзін час людзей таленавітых, шчырых, добразычлівых. Так было і ў апошнюю маю змену, якая, на жаль, таксама праляцела імкліва, быццам нарачанская чайка над азёрнымі хвалямі. Але зноў і зноў прыгадваюцца сустрэчы, размовы з аднагодкамі, настаўнікамі і важатымі. З такімі, у прыватнасці, як Алена Іванаўна Самуль, Віталь Уладзіміравіч Мілкоўскі, Алена Васілеўна Лабанок, Ілья Вадзімавіч Сцяпанаў, Павел Віктаравіч Роўба. Кожны з іх неардынарная асоба. Вось толькі некалькі прыкладаў.

Алена Самуль па адукацыі географ. Нарадзілася ў азёрным краі — на Браслаўшчыне, але, па асабістым прызнанні, добра плаваць так і не навучылася. Любіць падарожнічаць, марыць убачыць горы, захапляецца чытаннем кніг, жыве пастаянным імкненнем да новага, цікавага і карыснага. Асабліва цэніць адкрытых, харызматычных, жыццярадасных людзей. Зрэшты, сама яна менавіта такая. А яе любімы афарызм з Канфуцыя — «Выберыце сабе работу па душы, і вам не давядзецца працаваць ніводнага дня ў сваім жыцці», — стаў і маім таксама.

Спектр захапленняў Віталя Мілкоўскага шырокі і рознабаковы: тэатр, жывапіс, спорт, музыка, КВЗ, тэхніка. Жыццёвы дэвіз просты: быць шчаслівым — значыць, любіць сваю працу. А вось яшчэ адна яго мара — завесці сабаку — пакуль не збылася. Не сумняваюся — збудзецца!

Алена Лабанок таксама выпускніца геафака, якая марыць аб'ехаць увесь свет, у крайнім выпадку — хоць бы яго палову. Жыццёвая пазіцыя — знаходзіць станоўчыя моманты ва ўсім, умець радавацца простым жыццёвым рэчам. Лічыць, што самы карысны навык, які яна набыла ў жыцці, — гэта ўменне разважаць пазітыўна і ніколі не сумаваць.

«Выканаць можна ўсё, трэба толькі ведаць, як», — так лічыць Ілья Сцяпанаў. Сярод яго захапленняў — традыцыйная і сучасная беларуская культура, рок-, панк-, фолк-музыка. Упэўнены, што работа з дзецьмі, часам з нечаканымі сюжэтамі і сітуацыямі, вельмі дапамагае не страціць веру ў чалавецтва.

Дзве вышэйшыя адукацыі мае Павел Віктаравіч Роўба. Па першай ён настаўнік беларускай мовы і літаратуры, па другой — выкладчык фізікі і матэматыкі. Таму і захапленні, здавалася б, дыяметральна процілеглыя: любіць дакладныя навукі і ў той жа час вельмі цэніць творчасць Кандрата Крапівы. Актыўны ўдзельнік КВЗ, займаецца вёрсткай педагагічнай газеты, захапляецца мастацтвам ва ўсіх яго праявах.

Гэта толькі некалькі штрыхоў да партрэтаў важатых і настаўнікаў «Зубраняці», з якімі, хоць і на кароткі час, звёў мяне лёс. Усе яны шукаюць і знаходзяць сябе ў гэтым жыцці і імкнуцца быць карыснымі для іншых. Дарэчы, як і мае равеснікі са змены «Прэс-перспектыва» 2016 года. Так, Данііл Грамыка з Магілёва заканчвае школу (профіль — фізмат), марыць паступіць у БНТУ. Займаецца спортам, захапляецца музыкай, цэніць і паважае творчых людзей. Даша Рачок таксама магіляўчанка. Англійская, нямецкая, італьянская мовы — яе прыярытэты сярод прадметаў у школе. Нават спрабуе пісаць вершы па-англійску. Акрамя гэтага, скончыла музычную школу па класе фартэпіяна, зараз імкнецца авалодаць гітарнай тэхнікай. Кажа, што ёй проста падабаецца жыць, з падзякай прымаючы ўсе імгненні і дробязі паўсядзённасці. Ксенія Харава з Ліды з дзяцінства захапілася танцамі. Прычым рознымі іх відамі — ад класічных да народных. Любіць паэзію, бо, на яе думку, у вершах можна знайсці сябе. Родам з Ліды і яшчэ адна Ксенія — Луцэвіч — аматар тэатра, сцэны. Яна любіць спяваць і нават запісала аўтарскую музычную гульню-праграму для дзяцей.

«Шукаць сябе» ў гэтым жыцці зараз, каб не згубіцца ў ім потым — гэтага правіла прытрымліваюцца мае равеснікі, з якімі я пазнаёмілася на нарачанскай змене. Яраслаў Каліноўскі, Даша Серак, Ягор Муха, Мікіта Бычкоў, Данііл Восіпаў — пра кожнага з іх можна расказаць шмат цікавага, таму што ўсе яны — з актыўнай жыццёвай пазіцыяй, са сваімі перакананнямі, захапленнямі і жаданнямі. А мары, напэўна, і прыдумалі людзі для таго, каб яны хоць зрэдку, ды збываліся. Вось у мяне ў кастрычніку 2016-га на адну мару стала менш: у конкурсе відэапраграм мой праект «Зубраняці» прысвячаецца...» быў прызнаны лепшым і я атрымала такі «Крыштальнага зубра».

...У адзінаццатым класе асабліва адчуваецца імклівасць часу. Хочаш зрабіць многае, ды паспяваеш не ўсё: не хапае гадзін у сутках — хоць плач! Але ў рэдкія хвіліны адпачынку, калі бяру ў рукі невялікую фігурку крыштальнага зубраняці, зноў і зноў прыходзяць на памяць імгненні мінулай восені. Ды і сніцца часам Нарач. І, як мне здаецца, сніцца не толькі мне, але і яму — маленькаму зубраняці. Бо мы пазнаёміліся з ім у адным і тым жа месцы, а значыць штосьці нас аб'ядноўвае?

Лізавета АНІКЕВІЧ,
вучаніца 11 класа гімназіі №1
г. Жодзіна.

ПРА АЎТАРА

Нашай чарговай аўтарцы 16 гадоў. Па прызнанні Лізаветы, яе любімыя прадметы ў школе — гэта гісторыя Беларусі, родная мова і фізічная культура.

— Я спяваю ў вакальным ансамблі «Вялікі перапынак», займаюся кулявой стральбой, з'яўляюся капітанам каманды «Алімп» інтэлектуальнага клуба гімназіі і рэдактарам гімназічнай газеты «МіГ». На працягу дзевяці гадоў займалася спартыўнымі бальнымі танцамі, маю шмат узнагарод рэспубліканскага ўзроўню, — кажа пра сябе дзяўчына, падмацоўваючы словы вялікім пералікам не толькі спартыўных дыпломаў, але і адзнак за ўдзел у шматлікіх інтэлектуальных і творчых спаборніцтвах. — Мару стаць тэлежурналістам.

«Лёгкага паркету», Маша!

Марыя Бялькевіч прыйшла «ў танцы» дзесяць гадоў таму. Пачынала з народных, але потым звярнула сваю ўвагу на бальныя. Цяпер яна пераможца і прызёр шматлікіх рэспубліканскіх турніраў, якія праходзяць кожны год.

Пра танцы мая аднакласніца можа расказваць бясконца. Ад яе я даведалася, што ёсць дзве асноўныя танцавальныя праграмы: лаціна і стандарт. І ў кожнай свае патрабаванні да касцюма. Для лаціны трэба кароткая і адкрытая сукенка, каб было зручна рабіць энергічныя рухі. Для другой праграмы характэрныя доўгія і пышныя ўборы. Адна з такіх сукенак — любімая: «Яна яркага пунсовага колеру, з мноствам розных камянёў, якія пераліваюцца ў промнях сафітаў».

Яшчэ адзін немалаважны элемент касцюма — туфлі на высокіх абцасах, на якіх не так проста танцаваць, як прызналася Маша. «Аднойчы мы прыехалі ў Мінск на конкурс. Літаральна за дзесяць хвілін да выступлення я падымаюся па лесвіцы і разумею, што ў мяне ламаецца абцас. Мне стала вельмі страшна, я плакала. Але, на шчасце, тата хутка купіў суперклей і паспеў усё выправіць. Мы добра выступілі і занялі першае месца», — з хваляваннем прыгадвае дзяўчына.

Магчыма, удала выступіць тады дапамагла і яе «шчаслівая» прычоска: «На кожны конкурс я парознаму заколвала валасы, але потым заўважыла, што калі рабіла адну і тую ж прычоску, мы заўсёды займалі прызавыя месцы. Да таго ж мне падабаецца гэты хахалок з невялікім начосам, пасыпаны бліскаўкамі. Гэта, так бы мовіць, і ёсць мой талісман».

Але складнікам удалага выступлення з'яўляюцца не толькі правільна падабраныя сукенка, туфлі і прычоска, а ў першую чаргу добры партнёр. Свайго аднакласніка Мікіту Івашанку Маша ў літаральным сэнсе прывяла за руку ў бальныя танцы, і ён імі захапіўся.

З таго часу былі дзясяткі выдатных выступленняў і перамог на розных конкурсах. «Дваццаць пять медалёў вісяць у маім пакоі, на люстры. Часам баюся,

каб яна не звалілася мне аднойчы на галаву», — жартуе мая аднакласніца.

Зразумела, што пара не танцавала б так выдатна без добрага трэнера, які заўсёды падтрымае і зразумее, — Аляксандра Драгамірава. «Перад кожным конкурсам ён жадае нам «лёгкага паркету», як гэта прынята ў бальных танцах», — кажа юная танцорка.

Дарэчы, Марыя таксама спрабуе сябе ў ролі настаўніка-харэографа: Аляксандр Валер'евіч часам дазваляе ёй праводзіць трэніроўкі ў малодшых хлопчыкаў і дзяўчатак. «Мне падабаецца глядзець, як яны вучацца, бо гэтыя пачаткоўцы так падобныя на мяне ў дзяцінстве. Да таго ж я вельмі люблю дзяцей», — з усмешкай гаворыць пераможца нядаўняга раённага конкурсу прыгажосці і таленту «Міс БРСМ».

У вольны ад вучобы і танцаў час дзяўчына любіць чытаць раманы замежных пісьменнікаў, напрыклад Рэя Брэдберы і Оскара Уайльда. Таксама яна скончыла музычную школу па класе фартэпіяна і можа сама выканаць вальс для сваіх юных вучняў.

Ірына ЖАЛНЯРОВІЧ,
вучаніца 10 класа гімназіі
№3 г. Маладзечна.

ПРА АЎТАРА

— Я вельмі люблю музыку, летась скончыла дзіцячую школу мастацтваў па класе фартэпіяна, спяваю і ў вольны час іграю на маім любімым музычным інструменце. Калі прыходзіць натхненне, пішу вершы, і адзін з іх я нядаўна адправіла на рэспубліканскі конкурс «Слова ў пераплёце». Яшчэ я вельмі люблю глядзець фільмы і раней марыла стаць рэжысёрам, — расказвае Іра.

Таксама апошнім часам 15-гадовую аўтарку зацікавіла журналістыка, таму яна прыйшла ў гурток журналістыкі пры «Маладзіку». «Магчыма, у будучыні я звяжу сваё жыццё з гэтай прафесіяй».

Прафесія — толькі па душы

У дзяцінстве яна зачытвалася дэтэктывамі Агаты Крысці, уяўляла сябе агентам 007, не прапускала ніводнай серыі фільма «Вяртанне Мухтара» і марыла пра нямецкую аўчарку.

Сабаку ёй не купілі, але дзіцячая мара перарасла ў мэту — стаць міліцыянерам. І зараз мая аднакласніца Валерыя Крышталь рыхтуецца да паступлення ў Акадэмію МУС. Як вядома, для гэтага патрэбна добрая фізічная падрыхтоўка. Але Лера заўсёды была спартыўнай дзяўчынкай, з дзяцінства займалася танцамі, удзельнічала ў школьных спартландыях, некалькі разоў абараняла гонар школы ў раённых спаборніцтвах па мнагабор'і.

— Падчас кірмашоў і фестываляў ніколі не прапускаю магчымасці праверыць сваю трапнасць у ціры. Звычайна выбіваю 35 з 40, але не апускаю вінтоўку, пакуль не патраплю ў «яблычак», — прызнаецца дзяўчына.

Бацькі не падзяляюць выбар дачкі, а сябры, ведаючы Леру, раяць паступаць у Інстытут культуры. На самай справе, Валерыя вельмі творчая і ініцыятыўная. Колькі памятае сябе — спявае, а яшчэ займалася ў фальклорным гуртку «Скарбніца», была адзначана дыпломам на раённым фестывалі беларускай народнай творчасці «Беларусь — мая песня». Апроч таго, дзяўчына — нязменная вядучая школьных свят і вечароў.

Год таму Валерыя скончыла мастацкую школу. Яе дыпломнай работай была карціна ў стылі сюррэалізму. У гэтым кірунку пісалі, напрыклад, Сальвадор Далі і Марк Шагал. На карціне «Выбар» Валерыя намалявала дзяўчыну ў доўгай фіялетавай сукенцы, якая знаходзіцца ў пошуку ўнутранага «я» і свайго жыццёвага шляху. Як прызнаецца Лера, менавіта цяпер яна, як ніколі, разумее сваю гераіню, таму што і сама стаіць перад выбарам:

— Я, вядома, паважаю меркаванне бацькоў і сяброў, але ўсё ж такі прафесію трэба выбіраць па душы, і я адчуваю, што крыміналістыка — гэта маё прызванне. Творчасць застанецца са мной і будзе часткай майго жыцця, а стаўшы міліцыянерам, я змагу прынесці рэальную карысць грамадству.

Валянціна ТРУБАЧ, вучаніца 11 класа гімназіі №10 г. Маладзечна.

ПРА АЎТАРА

Як кажа сама аўтарка, за 17 гадоў жыцця ў яе было шмат захапленняў: выпальванне, пляценне з пацерак, танцы, камп'ютарная графіка. Дзесяць гадоў Валянціна займалася ўсходнімі адзінаборствамі. Любіць чытаць класічную рускую і беларускую літаратуру.

— Цяпер маё галоўнае пытанне: кім быць? — прызнаецца дзяўчына. — Мне вельмі падабаецца пісаць кароткія замалёўкі, эсэ, сачыненні, нататкі. Я планую паступаць у Інстытут журналістыкі БДУ. Як і гераіня нататкі, хачу праз гэтую прафесію прыносіць карысць грамадству.

ЧЫРВОНКА Чырвоная змена
5 01 2017 г.

SEX=БАЛЯСЫ

ШТО І СВЕЦІЦЬ, І ГРЭЕ

Іспанскія вучоныя нядаўна даказалі: каханне рэальна грэе. (Адразу ж не магу ўстрымацца ад зайздрасці: «Вучоныя-даследчыкі ў галіне сексу доследным шляхам устанавілі, што не так ужо і дрэнна быць вучонымі-даследчыкамі ў галіне сексу».) Яны высветлілі, што тэмпература скурнага покрыва можа быць добрым індыкатарам рамантычных пачуццяў. («Я стамілася, я нікому не патрэбная, мяне ніхто не любіць! — А ты дакладна ўсіх апытала?») Удзельнікаў эксперыменту сфатаграфавалі ў інфрачырвоных прамянях. Затым «паддоследныя» па чарзе акуналі рукі ў ледзяную ваду. Пасля чаго закаханым добраахвотнікам паказвалі фота іх рамантычных партнёраў, а астатнім — здымкі сяброў. І высветлілася, што ў першых удзельнікаў эксперымента рукі адаграваліся хутчэй, чым у другіх.

Паскоранаму саграванню закаханых спадарожнічала павышэнне тэмпературы шчок, ілба і носа. Яна павялічвалася ў сярэднім на два градусы, што і фіксаваў цеплавізар. «І не сорамна вам, дзяўчына, такія сексуальныя фантазіі ў мяне выклікаць?!» Чым глыбей пачуцці, тым больш відавочнай была рэакцыя. («Як дабіцца сексу ад дзяўчыны? 1. Кахаць. 2. Заляцацца. 3. Дарыць кветкі і прэзенты. 4. Нагадваць ёй, што яна — ваша жонка, у рэшце рэшт».)

У многім падобны эксперымент пры дапамозе тых жа цеплавізараў правялі канадскія вучоныя-медыкі. Высвятлялі некалькі іншае, чым іх іспанскія калегі, але вынік атрымалі такі ж. Даследчыкі задаліся мэтай праверыць: ці праўда, што жанчынам трэба нашмат больш часу, каб «завесціся» сексуальна. Падчас эксперымента 30 жанчынам і 30 мужчынам паказвалі відэа эратычнай накіраванасці. («Нямецкія навукоўцы стварылі антывіягру для спакойнага і ўдумлівага прагляду фільмаў «для дарослых».») І засякалі, за які час яны ўзбудзяцца. Высветлілася, што мужчыны даходзілі «да кропкі кіпення» ў сярэднім за 665 секунд, а жанчыны — за 743 секунды. Па меркаванні даследчыкаў, адрозненне ў 78 секунд не з'яўляецца такім ужо і значным. («Аднойчы ты засумуеш па мне і зразумееш: час вучыць, а не лечыць».) Маўляў, прадстаўнікі абодвух палоў «даходзяць да кандыцыі» за аднолькавы час.

Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

І вось што цікава. Медыкі падкрэсліваюць: вымярэнні былі дакладнымі (зноў глядзі самы першы анекдот у пачатку). На экранах цеплавізараў было добра бачна, як награваюцца інтымныя месцы «паддоследных». І ў мужчын, і ў жанчын, якія былі ахоплены эратычным настроем, тэмпература «там» павялічвалася, як у закаханых з эксперымента іспанскіх вучоных, усё на тыя ж два градусы. «Флірт па-вясковаму. «Ульяна, ты цыбулю ясі? — Ем. А сала ясі? — Ем. Ах ты, мая ласуха!»)

Але каханне, як вядома, не толькі грэе. Можа хто памятае савецкі фільм «Ход у адказ» пра сумесныя вучэнні дэсантнікаў і марскіх пехацінцаў? Камандзіра апошніх — капітан-лейтэнанта Швяца — іграў брутальны Вадзім Спірыдонаў. У яго групе радыстам была сяржант Зіноўева ў выкананні актрысы Алены Глебавай. Для тых, хто не ў курсе: гаворка ідзе пра службу дзяўчыны ў страявой вайсковай часці элітнага роду войскаў. Наўрад ці такое магло быць у жыцці, але гэты кіношны прыём нікога ў тыя часы не мог пакінуць раўнадушным. Па сюжэце мімаходзь згадваецца, што ў камандзіра быў няўдалы шлюб, а Зіноўеву ў армію прывялі любоўныя праблемы. Падчас вучэнняў група пранікае ў падземныя камунікацыі ўмоўнага праціўніка. Той, выявіўшы «дыверсантаў», адключае святло. Капітан-лейтэнант дае каманду: «Сяржант, падсвяці!» Зіноўева вокамгненна зрывае з пляча аўтамат і пачынае біць уверх кароткімі чэргамі (патроны халастыя — гэта ж вучэнні). У кароткіх успышках ад полымя, якое вырываецца са ствала зброі, мы бачым яе твар, яго твар, патрэбны кабель, які трэба перарэзаць... Апёкшыся аднойчы ў жыцці, і яна, і ён не жадаюць больш зведаць падобнага, як і прычыніць боль іншаму. Абодва выглядаюць і паводзяць сябе сурова, зноў жа накладае адбітак армейская субардынацыя. Аднак відавочна тое, што паміж імі ёсць нешта няўлоўнае, што іх звязвае. Не гаворачы нічога, толькі адным фактам прысутнасці побач яны падсвечваюць жыццё адно аднаму...

«І не сорамна вам, дзяўчына, такія сексуальныя фантазіі ў мяне выклікаць?!»

Праўда, і «падсвечваць» можна па-рознаму. Вось таксама армейская гісторыя ў тэму, пачутая ад бывалага чалавека. Служыў з ім адзін прапаршчык, загадваў сталовай. Скарыстаўшы апошнюю акалічнасць, вёў неблагую ўласную падсобную гаспадарку: адкормліваў свіней, качак, трусоў адходамі з салдацкага стала. І вось неяк вяртаецца ён у часць... з велізарным «ліхтаром» пад вокам. Камандзір убачыў: «Хто?» «Ліда!» — дакладвае прапаршчык. Жонка, значыць, жанчына мажная і з суровым характарам. Як потым высветлілася, саслужыўцы вайскоўца вырашылі пажартаваць: падкінулі ў бачкі для харчовых адходаў... прэзерватывы. «Дык вось вы чым займаецеся на тым палігоне», убачыўшы іх, імгненна вынесла прысуд Ліда і «падсвяціла» мужу вока. («Муж сказаў, што паміж намі няма іскры. Купіла электрашокер... Калі ачомаецца, спытаю яшчэ раз».) Ну, а з іншага боку, без кахання яна б так не зрабіла, праўда? Як у тым анекдоце. «Нічога нельга рабіць без любові. Таму посуд мыць не буду!»

Кастусь ХАЦЕЛАЎ-ЗМАГЕЛАЎ.

«У маёй працы карысны нават малаток»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)

Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

— Ты сам навучыўся?

— Так, у асноўным сам. Каб навучыцца, патрэбна вельмі шмат часу. Многае трэба асэнсоўваць самастойна, ніводны ўніверсітэт не навучыць, як працаваць. Карысным можа стаць досвед калег. Некаторыя замежныя кампазітары на сваіх старонках дзеляцца сакрэтамі майстэрства, выдаюцца адмысловыя часопісы для дызайнераў гуку. Толькі сёння, гадоў праз пяць самастойных заняткаў, я магу сказаць, што напісаў нешта вартае. Але ўсё роўна гэта не галівудскі ўзровень. Насамрэч, пісаць музыку для кіно і гульняў вельмі цікава. Але пакуль што ў Беларусі мала людзей, якія займаюцца гэтай справай.

— Якія свае работы можаш назваць у ліку найлепшых?

— Ёсць праекты, у стварэнні якіх я ўдзельнічаў, дзе мне падабаецца музыка, але сам вынік атрымаўся не надта «выбухным». Напрыклад, запомнілася адна гульня, для якой я напісаў саўндтрэк. Там гучыць аркестр, сумешчаны з этнічнымі інструментамі. Музыка атрымалася проста выдатная, але, на жаль, гульня закрылася праз паўгода пасля выпуску.

«Лязгат мячоў, што мы чуем у фільмах, — гэта часцей за ўсё гукі бразгання сталовых прыбораў. Для гэтага няма сэнсу набываць сапраўдную зброю».

— Ты аўтар музычнага праекта Dzivia, досыць папулярнага ў колах аматараў цяжкой музыкі. Як творчасць у яго межах суадносіцца з, так бы мовіць, камерцыйным кампазітарствам?

— Дзякуючы менавіта гэтаму музычнаму праекту мяне заўважылі як кампазітара. Гэта было ў час, калі я нават не здагадваўся, што магу працаваць у гэтым кірунку і зарабляць грошы. Прынамсі, у нас. Dzivia існуе ўжо досыць доўга. Я вельмі даўно займаюся гэтым праектам і проста не магу яго кінуць. Як сесійны музыкант удзельнічаю ў іншых гуртах, больш мэйнстрымавых. Часам вельмі шкадую, што і сам не пачаў іграць стандартную музыку з дзвюма гітарамі, басам, барабанамі і вакалам *(смяецца)*. Напрыклад, мне вельмі складана знайсці барабаншчыка: патрэбны чалавек, які мае свой вялікі этнічны інструмент і іграе на ім. Такіх у нашай краіне адзінкі. Але Dzivia існуе, развіваецца. Мы запісваем новы альбом. Да ўдзелу ў праекце я запрасіў яшчэ каля дзесяці музыкантаў. Палова з іх — гэта вакалісты. Зараз збіраю жывы склад, спрабую зладзіць выступленне. Мы плануем канцэрты і хочам выйсці са студыйнага фармату.

— Не баішся выйсці да публікі?

— Гэта для мяне больш страшна, чым удзельнічаць у канцэртах як музыканту. Першае выступленне з Dzivia будзе як першы раз на сцэне ўвогуле. Я ўпершыню выйду да слухача менавіта са сваім праектам. Як музыкант выступаю з іншымі гуртамі, часам удзельнічаю ў вялікіх канцэртах высокага ўзроўню, але гэта не мае праекты, таму не надта хвалююся. Але ў Dzivia ўся музыка мая.

— Адкуль такое жаданне іграць музыку, не падобную на тую, што выконваюць іншыя нашы гурты?

— У Беларусі няма гуртоў, якія іграюць аркестравую музыку для «металістаў». Я не ведаю, як ахарактарызаваць стыль, у якім я іграю, часам называю яго pagan orchestral — гэта нешта сярэдняе паміж фальклорам, аркестравай музыкай і «металам». Хоць тут няма характэрных рыс апошняга — гітар, гучных барабанаў, але ёсць адмысловы вакал, эпічнасць. Цікава, што маю музыку пачалі слухаць менавіта «металісты».

— Ты сам разумееш, калі напісаў нешта сапраўды грандыёзнае, што яно спадабаецца людзям?

— Нічога такога няма. Калі б я знарок пісаў музыку, якая падабалася б людзям, то мая творчасць была б іншай. Магчыма, больш папсовай, можа быць, я іграў бы «метал». Але ў творчасці арыентуюся толькі на ўласны густ.

— Сёння фолк у музыцы надзвычай актуальны, запатрабаваны і нават папулярны. Як бачыцца праект Dzivia ў кантэксце музычнай сцэны краіны?

— У мяне крыху іншая музыка. У нас многа каманд, падобных на «Старога Ольсу». Гэтая музыка вельмі добра падыходзіць для фестываляў сярэднявечнай культуры, стварае антураж, але як сама па сабе для мяне нецікавая. Мне падабаецца Re1ikt — вельмі незвычайны праект для Беларусі, я неяк выпадкова трапіў на іх канцэрт і дагэтуль з захапленнем слухаю. Таксама на ўзроўні музыка Drwiwy. А ў цэлым я многа слухаю «метал» і нікому не вядомыя, амаль андэграўндныя гурты.

— Што параіў бы маладым людзям, якія хочуць пісаць музыку?

— Не рабіце гэтага! Кампазітарствам у нас вельмі складана займацца, а зарабляць — амаль немагчыма, здымаецца вельмі мала фільмаў. Калі параўнаць, напрыклад, з Францыяй, дзе амаль кожны трэці чалавек нейкім чынам звязаны з кіно, а кампазітары нават могуць выбіраць найцікавейшыя з некалькіх прапаноў. Большасць нашых кампазітараў, таксама як і праграмістаў, працуюць на краіны Еўропы. У нас гэта незапатрабаваная справа. Трэба самому шукаць заказы, нейкім чынам «круціцца».

«Праз пяць гадоў самастойных заняткаў я магу сказаць, што напісаў нешта вартае. Але ўсё роўна гэта не галівудскі ўзровень».

— Можа, раскрыеш сакрэты, як запісваюцца гукі для кіно, гульняў?

— Гэта вельмі цікава і часам непрадказальна. Напрыклад, для гульні патрэбна запісаць начны лес. Прычым заказчык патрабуе арыгінальную мелодыю. Таму едзеш ноччу ў лес з мікрафонам, ноўтбукам і начуеш там у спальніку. Хрумсценне снегу запісваецца паралонам, а ўдары ў цела — насамрэч удары ў памідоры. Лязгат мячоў, што мы чуем у фільмах, — гэта часцей за ўсё гукі бразгання сталовых прыбораў. Для гэтага няма сэнсу набываць сапраўдную зброю. Вельмі карысны ў працы кампазітара і малаток, якім на кухні мяса адбіваюць. У гульні цікава гукамі паказваць персанажа. Ён робіць рух — і яго трэба паўтарыць у гуку, пры гэтым сінхранізаваць з рэчаіснасцю.

— Напэўна, усе сталовыя прыборы пабывалі ў цябе ў студыі?

— Так. Няма студыі, дзе імі не карысталіся б для запісу *(смяецца)*. Калі прыходзіш на студыю па агучванні, там можна знайсці што заўгодна — як у анекдоце пра жаночую сумачку. Любая дробязь істотная.

Марына ВЕСЯЛУХА.
vesialuha@zviazda.by

ЧЫРВОНКА Чырвоная змена

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ №12
ад 19 лютага 2009 года выдадзена
Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Заснавальнікі газеты —
Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»,
грамадскае аб'яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі».
Дырэктар — галоўны рэдактар
СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

Адказныя за выпуск: рэдактар аддзела
Надзея НІКАЛАЕВА, рэдактар аддзела Сяргей РАСОЛЬКА.
Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
Адрас рэдакцыі: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.
Кантактныя тэлефоны: 292 44 12, 287 17 41.
e-mail: info@zviazda.by
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
ЛД №02330/0494179 ад 03.04.2009.
220013, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.
Тыраж 20.008.
Нумар падпісаны ў 19.30 04.01.2017 г.

«Што ні вёсачка — то журавінка»

Быў у Злучаных Штатах Амерыкі, Аўстраліі, захапляўся вадаспадам Вікторыя на поўдні Афрыкі і біблейскім Вавілонам у Іраку, крочыў па рысавых чэках Кітая, блукаў па гарах Іспаніі, Чарнагорыі... Нястомны вандроўнік, журналіст Уладзімір Субат, які ўсё жыццё прысвяціў расповедам пра беларускія вёскі, шчыра прызнаецца, што нідзе ў свеце не знаходзіў таго цяпла, такога ж ветлага сонца, як над Беларуссю. А калі дакладней — над яго родным Палессем. Журналісцкі досвед працы ў тэлепраграмах, прысвечаных нястомным хлебаробам, пошук адметных герояў у беларускай глыбінцы выліліся ў кнігі. Уладзімір Паўлавіч — аўтар паэмы «Столінская вандроўка», а не так даўно ў Выдавецкім доме «Звязда» выйшаў яго грунтоўны зборнік партрэтаў-інтэрв'ю «Вытокі». Пра жыццё ў вандроўках, супрацьстаянне сям'і і прафесіі, а таксама любоў да працы і шчымлівыя моманты шчырасці з героямі — гутарка з Уладзімірам СУБАТАМ.



— Зазвычай людзі імкнуцца «збегчы» з райцэнтра ці вёскі ў сталіцу, наладзіць свой побыт у гарадской кватэры, а вясковы дом выкарыстоўваць толькі ў якасці лецішча. У вас жа атрымліваецца ўсё наадварот — фактычна ўсё жыццё жывяце ў Мінску, але і сёння большасць часу бавіце ў родных мясцінах, у палескім Століне...

— Не ведаю, добра гэта ці кепска, але пупавіна, што звязвае з вёскай, не перасохла. Для мяне маці, вёска і Беларусь — тоесныя. Тая любоў да роднай зямлі, што далі бацькі, — найдаражэйшая. Кожны раз як на крылах лячу з Мінска ў вёску. У сталіцы жыву амаль паўвека, але здаецца, жыццё тут — як побыт у інтэрнаце, мой дом у палескай глыбінцы, дзе нястомна бурліць няўрымслівая рака Гарынь. Калі заходжу ў вясковую хату і адчуваю пах хлеба, малака, разумею: гэта маё, роднае. Гэтыя пахі — лепшыя за ўсялякія французскія духі. Хіба можа не кранаць водар зямлі, які адчуваеш, ідучы па вясновай раллі? Я пабудаваў мур на дзедавай сядзібе ў Століне. Душою там адпачываю. Калі ажывае вясновы сад, здаецца вось-вось з-за квітнеючых дрэў выйдзе маці, пачне касіць лугавіну бацька. Сям'я пярэчыла: усе будуюцца каля Мінска, а я — амаль за 400 кіламетраў. І амаль штопятніцы сядаю ў цягнік і імчу 7 ці 8 гадзін у родныя мясціны. Там жа карані! Ды і з суседзямі люблю пагутарыць, яны мяне таксама чакаюць і радуюцца прыездам. Там заўжды цікава і найлепш пішацца.

«Вялікае шчасце — расказваць пра людзей, якіх любіш, асабліва калі яны жывуць на дарагой табе зямлі».

— Ваша новая кніга, дзе сабраныя інтэрв'ю з рознымі людзьмі, мае досыць сімвалічную назву — «Вытокі». Чаму абралі менавіта гэтае слова?

— Кожны песціць свае вытокі. Гэта тое патаемнае, святое, што ёсць у кожнага ў сэрцы. Варта націснуць на тую «кнопачку», знайсці ключ, каб іх адкрыць. Для мяне вялікае шчасце — адкрываць вытокі ў кожнага з герояў, знаходзіць глыбіннае. Важна таксама, каб табе яго даверылі.

— Ці лёгка вам людзі адкрываюцца? Маеце сакрэты даверлівых гутарак са сваімі героямі?

— Дабіцца таго, каб герой распавядаў пра сябе, як на споведзі ў храме, — найвышэйшая вяршыня прафесіяналізму любога журналіста. Беларусы шчырыя і адкрытыя, да іх трэба толькі таксама шчыра ставіцца. Самы просты сакрэт — я ніколі ні перад кім не «малююся», які ёсць — такі ёсць. Такі мой масток да чалавека. Заўсёды ў сваім героі імкнуся знайсці нейкія рысы, каб ім можна было захапіцца, палюбіць яго. Прыгадваецца: гутару аднойчы з даяркай, яна ў гумавых ботах, рукі парэпаныя. Гляджу — якія ў яе прыгожыя сінія вочы — як азёры. А другая бабуля з хойніцкай вёскі Глінішча — 98 гадоў, яе сын сябраваў з Іванам Мележам. Калі ўвайшоў у хату, яна на печы цыбулю перабірала. Павіталася, злезла — і я ўбачыў яе постаць царыцы. Уявіў, якой прыгажуняй была ў маладосці! Здараюцца і вельмі незвычаныя гісторыі, знаёмствы. Гэтая ж бабуля з Глінішча расказала, якой прыгожай была паляшучка, што стала прататыпам мележаўскай Ганны Чарнушкі. Аказалася, што яна яшчэ жывая. Знайшоў яе сядзібу на ўскрайку вёскі Каранёўка. Была зіма. Заходжу ў двор, а перад сенямі ляжыць гара напілаваных дроў. З акна пазірае бабулька. Як толькі ўбачыў яе твар — адразу пазнаў мележаўскую гераіню. Адзінае, што на твары адбілія павуцінкі часу. Гаспадыня выйшла з хаты, паспрабаваў загаварыць, пазнаёміцца, а яна адразу: што знаёміцца, няма каму дровы пакалоць. Я не доўга думаў, узяў сякеру і ўзяўся за справу. А потым завязалася гутарка. І я ў той момант не «красаваўся», сапраўды хацеў дапамагчы састарэлай сялянцы, адразу ўявіў, як сваім унукам буду расказваць пра сустрэчу з такой цікавай асобай.

Падчас канферэнцыі ў Брэсце, пачатак 1990-х.

— Атрымліваецца, што тыя вытокі, якія жывяць нашу нацыю, яднаюць мінулае і сучаснасць, яшчэ можна адшукаць у беларусах?

— Так. І гэта не толькі матэрыяльныя рэчы. Прыехаў аднойчы ў Смаргонь, на радзіму Францішка Багушэвіча. У музеі ўбачыў крэслы, на якіх сядзеў некалі пісьменнік. Вельмі хацеў да іх дакрануцца, але не наважыўся. Пазней пазнаёміўся са смаргонскімі сялянкамі, якія да таго ж выдаліся галасістымі пявуннямі. Іх самабытныя спевы краналі душу. У голасе жанчын гучала тая самая магічная мелодыка, якую чуў і якой натхняўся Багушэвіч! Кожная мясціна ў Беларусі валодае пэўнай магіяй, яна кранае, няма куточка, які нельга не палюбіць.

— Але ж мы кажам пра сучасную вёску, тут лад жыцця паступова змяняецца, гэта не тое традыцыйнае беларускае грамадства.

— Сапраўды, сённяшняя вёска — не патрыярхальная, яна сучасная. Напрыклад, часта прыязджаю ў Альшаны, вядомы аграгарадок на Палессі. Амаль дзесяць тысяч жыхароў, дзве сярэднія школы. Альшаны на вачах пашыраюцца, як цеста ў дзяжы прыбывае. Памятаю, там некалі жыла выдатная жанчына Параска Шут, на партыйных з'ездах у Маскве ў прэзідыуме сядзела побач з кіраўнікамі вялікай дзяржавы. Была вядомай ільнаводкай у пасляваенныя гады, сябравала з Іосіфам Броз Ціта і перапісвалася з яго жонкай. Была знаёмая з Брэжневым. Калі згарэла альшанская царква, людзі пачалі будаваць новую. Параска па лесвіцах падымала вёдры з цэментам пад самы купал. Ёй было 92! Я запытаўся, адкуль такая энергія? Яна адказала, што ад Бога...

— А ў вашай працы здараліся выпадкі, калі нават жыццю пагражала небяспека?

— Аднойчы сярод ночы выйшаў з цягніка і пакуль агледзеўся, што не мая станцыя, састаў ужо адыходзіў. Ледзьве паспеў ускочыць на прыступкі апошняга вагона. Пачаў грукаць у шкло, а тым часам поезд набіраў хуткасць... Толькі цудам мой грукат пачулі пасажыры, паведамілі правадніку, і ён адкрыў дзверы вагона. Імгненне вырашыла мой лёс. А неяк у вясновае разводдзе здымалі праграму пра жыццё адрэзанага ад свету вадой вострава Куба, што ў Столінскім раёне. Бурлівая Гарынь заліла ўсё навокал. Нашу лодку, на якой мы дабіраліся на Кубу, ледзьве не перавярнулі магутныя крыгі. Калі б гэта здарылася — наўрад ці выбраліся б з вады самі. У народзе кажуць: як Бог дасць — то і ў акно падасць. Тады сам не будзеш ведаць, адкуль што бярэцца. Гэта праўда. Мне заўсёды шчасціла і шчасціць, думаю, у тым ліку таму, што я раблю справу ад чыстага сэрца для Бацькаўшчыны. Маці-Беларусь адгукаецца і сама нібыта высцілае шлях.

— Бачна, што праца прыносіць задавальненне і вам самому. А можа, творыце перш за ўсё дзеля сябе?

— Напэўна, усё ж у першую чаргу дзеля сябе. А сабе ж кепска не зробіш. Нават бліны паніншаму пячэш: сабе патэльню тлусцей памажаш *(смяецца)*. Кожны раз, калі працую над матэрыялам — нібыта складаю ліст да маці. А ёй не схлусіш. Калі дадасі нешта ад сябе — як людзям у вочы глядзець будзеш? Вялікае шчасце — расказваць пра людзей, якіх любіш, асабліва калі яны жывуць на дарагой табе зямлі. Часам, калі працую, азіраюся, ці няма каго побач. Ад лёсаў герояў слёзы засцяць вочы. Перажываю за іх, як за сябе. Я ж мужчына, але ў той момант жыву тым, пра што пішу, і бывае так балюча! Нібыта са мной гэта адбываецца. Думаю таксама, як пакласці гісторыю на паперу так, каб яна кранула не мяне, а чытача. Бо не той гумар важны, калі апавядальнік сам смяецца, а калі рагочуць слухачы.

«Раней, калі выбіраў паміж журналістыкай і сям'ёй, на першае месца ставіў прафесію. Сёння радуюся: якое шчасце, што ўвечары маю магчымасць сустракацца з унукамі, бавіць з імі час».

— За столькі гадоў працы, напэўна, уздоўж і ўпоперак аб'ехалі Беларусь нават некалькі разоў. Ці ёсць мясціны, дзе вы яшчэ не былі?

— Не быў толькі ў адным беларускім горадзе — Лоеве. Мару туды з'ездзіць. Для мяне кожны горад мае сваю прыгажосць. Мёры — як беларуская Ялта, прыгожы высачэнны касцёл і набярэжная ўздоўж возера. Мазыр, Петрыкаў, Быхаў, Навагрудак! А Слонім з тэатрам і прыгажуняй-Шчарай. Які гарадок ні вазьмі, нават самы маленькі, — Дзісну — ён нечым адметны. А Лынтупы, Відзы пад Паставамі! Што ні вёсачка — то журавінка.

— Як шукаеце сваіх герояў?

— Спецыяльна ніколі не шукаю. Неяк самі «выплываюць», часам зусім нечакана. Ужо падчас першай сустрэчы, першага погляду ў вочы героя разумееш — матэрыял атрымаецца ці не. Няма цяпла ў позірках — справа не пойдзе. Так, у Слуцкім раёне жыве глухі і сляпы Мікалай Амельяновіч, у якога цудоўны свой сад. Яму амаль 80, пражыў жыццё без сям'і. Ён спачатку зусім не ішоў на кантакт. Але я разумеў, што не маю права пра яго не сказаць, бо мужчына адраджае сарты слуцкай бэры. З-за соляў, што распаўсюджваюцца ў паветры каля калійнага камбіната, грушы сталі гінуць. Але гэты садоўнік іх адрадзіў. Мне прыемна, што я ўсё ж вярнуўся да яго. Доўга мы размаўлялі з Мікалаем Дзмітрыевічам у Слуцкім тэрытарыяльным цэнтры сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва, дзе ён зараз знаходзіцца, і ўсё ж знайшлі агульную мову. Кажуць, кожны чалавек — гэта ненапісаны раман. І гэта праўда.

«Ужо падчас першай сустрэчы, першага погляду ў вочы героя разумееш — матэрыял атрымаецца ці не. Няма цяпла ў позірках — справа не пойдзе».

— Вы з такім захапленнем распавядаеце пра геранінь. Жонка не раўнуе? Як ставіцца да такой апантанай працы?

— Усяго было! Нават да развода ледзь не дайшло. Не кожная жанчына вытрымала б жыццё побач з такім заўзятым вандроўнікам. Але мая жонка разумее, што працоўны дзень журналіста амаль не ўнармаваны. Я ні разу яе ў радзільны дом не праводзіў, пра нараджэнне дачок даведваўся па тэлефоне — у камандзіроўках. Не бачыў, як раслі дзеці, усе клопаты былі на плячах жонкі. Я ёй вельмі за гэта ўдзячны. Часам і папракала, не прымала маю апантанасць працай, але, думаю, разумела, што я быў заняты забеспячэннем сям'і. Цяпер, калі маю ўнукаў, я сам пачынаю разумець каштоўнасць сям'і. Раней, калі выбіраў паміж журналістыкай і ёй, на першае месца ставіў прафесію. Сёння радуюся: якое шчасце, што ўвечары маю магчымасць сустракацца з унукамі, бавіць з імі час. І вялікая радасць, калі сям'я разам.

— Пісаць пра вёску — досыць складана і вельмі адказна. Каго з пісьменнікаў можаце назваць мэтрам гэтай справы?

— Не так даўно перачытваў раман «Бацькаўшчына» Кузьмы Чорнага і быў проста ў захапленні, як гэты творца ўмее падбіраць словы, як будуе тэкст, адлюстроўвае падзеі. Чорны настолькі глыбока пісаў пра беларускую вёску, што кожнаму журналісту, які пачынае працаваць у гэтым кірунку, варта павучыцца ў яго. Пісьменнік любіў вёску, так трапна пра яе пісаў, вымалёўваў вобразы, праз філасофію, думкі паказваў партрэты сялян 1930-х гадоў. Гэта вельмі цікава. Мы, журналісты, — таксама летапісцы. Зараз няма яркіх пісьменнікаў-сучаснікаў, аддадзеных вясковай тэме. Значыць мы павінны гэтую задачу ўзяць на сябе. Несці гісторыю беларускай вёскі, занатоўваць яе для наступных пакаленняў. Думаю, мае будучыя героі яшчэ мяне чакаюць.

Марына ВЕСЯЛУХА.
vesialuha@zviazda.by

Фотаздымкі з архіва Уладзіміра СУБАТА.

У вёсцы Палессе Чачэрскага раёна, студзень 1997 года.

Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА

Наименование	Характеристика
ЛОТ 1	
Наименование объекта, краткая характеристика, адрес расположения, земельный участок, на котором расположен объект	- незавершенное законсервированное капитальное строение, инв. № 451/U-14874 (назначение – здание неустановленного назначения, наименование – магазин), площадью 0,0 кв.м, расположенное по адресу: г. Дятлово, ул. Новогрудская, 25. Расположено на земельном участке, кадастровый номер 422350100001001102 (назначение – строительство и обслуживание магазина, инженерных коммуникаций, автомобильной стоянки и подъездной дороги к нему), площадью 0,5701, расположенном по адресу: г. Дятлово, ул. Новогрудская, 25. Земельный участок имеет ограничения (обременения прав в использовании): земельный участок, расположенный в придорожной полосе (контролируемой зоне) автомобильной дороги, код 7.1, площадью 0,0721 га; земельный участок, расположенный в охранных зонах линий связи и радиофикации, код 13.1, площадью 0,0062 га; - сооружение, инв. № 411/С-15592 (назначение – сооружение специализированное автомобильного транспорта и автодорожного хозяйства 3 06 02, наименование – автодром), площадью 3655,0 кв.м, расположенное по адресу: г.п. Большая Берестовица, ул. Восточная, 19. Расположено на земельном участке, кадастровый номер 420455100001001132 (назначение – земельный участок для размещения объектов иного назначения 1 16 00 (для обслуживания сооружений автодрома)), площадью 0,3655, расположенном по адресу: г.п. Большая Берестовица, ул. Восточная, 19. Земельный участок имеет ограничения (обременения прав в использовании): земли, расположенные в водоохранных зонах водных объектов, код 4.1, площадью 0,3655 га; - сооружение, инв. № 411/С-15580 (назначение – сооружение специализированное автомобильного транспорта и автодорожного хозяйства 3 06 02, наименование – автомобильная стоянка), площадью 2132,0 кв.м, расположенное по адресу: г.п. Большая Берестовица, ул. Анохина, 24, автомобильная стоянка, периметр 192,9 м. Расположено на земельном участке, кадастровый номер 420455100001001131 (назначение – земельный участок для размещения объектов автомобильного транспорта (автостоянок и гаражей)), площадью 0,2712, расположенном по адресу: г.п. Большая Берестовица, ул. Анохина, 24. Земельный участок имеет ограничения (обременения прав в использовании): земли, расположенные в водоохранных зонах водных объектов
Начальная цена продажи	435 907,20 р. (четыреста тридцать пять тысяч девятьсот семь рублей двадцать копеек) с учетом НДС
Сумма задатка	21 795,36 р. (двадцать одна тысяча семьсот девяносто пять рублей тридцать шесть копеек)
Условия аукциона	Без условий
Продавец	Гродненское областное потребительское общество, 230023, г. Гродно, ул. 1 Мая, 28. Тел. 72-30-50, факс 72-00-67
Организатор торгов	Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел. 41-98-32, 45-05-38
Условия оплаты	По договоренности сторон
Срок заключения договора купли-продажи	Не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов
Номер р/с для перечисления задатка	Р/с 3012579170017 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка 153001739, УНП 500833225

Аукцион состоится 06 февраля 2017 г. в 14.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209

К участию в аукционе допускаются физические лица, юридические лица и индивидуальные предприниматели, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона с указанием даты регистрации заявления и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» подается заявление на участие в аукционе со следующими документами: заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении; *юридическим лицом — резидентом Республики Беларусь* – копия документа, подтверждающая государственную регистрацию юридического лица; *индивидуальным предпринимателем* – документ, подтверждающий государственную регистрацию индивидуального предпринимателя, и его копия, которая заверяется организатором аукциона; *юридическим лицом — нерезидентом Республики Беларусь* – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с удостоверенным переводом на белорусский или русский язык.

